Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

Факультэт мастацкай культуры

Кафедра дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва

УЗГОДНЕНА
Загадчык кафедры
___________Р.Ф.Шаура
«22» красавіка 2026 г.

УЗГОДНЕНА
Дэкан факультэта
___________А.В.Пагоцкая
«22» красавіка 2026 г.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНЫ КОМПЛЕКС ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

# МАСТАЦТВА НАРОДНЫХ ПРОМЫСЛАЎ І РАМЁСТВАЎ БЕЛАРУСІ

для спецыяльнасці 6-05-0213-02 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: Народныя рамёствы і этнадызайн

Складальнік: Матвейчык С.В., старшы выкладчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва

Разгледжана і зацверджана на паседжанні Савета факультэта мастацкай культуры

«17» красавіка 2026 г., пратакол № 8

Рэцэнзенты:

Петухова Наталля Вячаславаўна, загадчык кафедры рэжысуры УА “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук

Скварцова Ірына Мікалаеўна, загадчык аддзела выяўленчага і дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ДНУ “Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі” філіял “Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы, кандыдат мастацтвазнаўства

Разгледжана і абмеркавана на паседжанні кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва

(пратакол ад 23.03.2026 г. № 8)

# ЗМЕСТ


| | | |
|---|---|---|
| 1. | ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА……………………………………….…….…..... | 4 |
| 2. | ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………….……..… | 5 |
| 2.1 | Уводзіны……………………………………………………………….. | 5 |
| 2.2 | Кераміка і ганчарства………………………………………………… | 12 |
| 2.3 | Вырабы з саломы і лазы ………………………………………………. | 14 |
| 2.4 | Дрэваапрацоўка………………………………………………………... | 15 |
| 2.5 | Роспіс…………………………………………………………………… | 20 |
| 2.6 | Апрацоўка металаў…………………………………………………….. | 27 |
| 2.7 | Тэкстыльныя рамёствы і промыслы…………………………………... | 30 |
| 3. | ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ……………………………………………….. | 44 |
| 4. | РАЗДЗЕЛ КОНТРОЛЮ ВЕДАЎ………………………………………... | 47 |
| 5. | ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ………………………………………………. | 48 |
| 5.1 | Вучэбная праграма……………………………………………………. | 49 |
| 5.2 | Асноўная літаратура…………………………………………………... | 60 |
| 5.3 | Дадатковая літаратура…………………………………………….….. | 61 |

# 1. ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Мастацтва народных промыслаў і рамёстваў Беларусі” з’яўляецца адным з кампанентаў адукацыйнага працэсу прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў кафедры “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва”.

Вучэбная дысцыпліна “Мастацтва народных промыслаў і рамёстваў Беларусі” арганічна звязана з шэрагам іншых вучэбных дысцыплін: “Матэрыялазнаўства”, “Гісторыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва”, “Беларуская і сусветная літаратура”, ”Гісторыя”, “Этнаграфія, міфалогія і фальклор беларусаў”, “Гісторыя сусветнага і беларускага мастацтваў”.

Асноўная мэта вучэбна-метадычнага комплекса – метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэса па дысцыпліне “Мастацтва народных промыслаў і рамёстваў Беларусі”.

Асноўнай функцыяй вучэбна-метадычнага комплекса з’яўляецца раскрыццё зместу дысцыпліны “Мастацтва народных промыслаў і рамёстваў Беларусі”.

Змест тэм дысцыпліны абумоўлены неабходнасцю фарміравання ў студэнтаў здольнасцей арыентавацца ў складаных праблемах мастацкага працэсу мінулага і сучаснасці; ведаць асаблівасці развіцця мастацтва рамёстваў і промыслаў Беларусі ад часоў фарміравання старажытнабеларускіх княстваў да ХХ стагоддзя; месца і ролю беларускага мастацтва ў еўрапейскім мастацкім працэсе.

Вывучэнне дысцыпліны “Мастацтва народных рамёстваў і промыслаў Беларусі” прадугледжвае самастойную работу студэнтаў, якая складаецца са сбору ілюстратыўнага і дадатковага матэрыялу па разглядаемых тэмах, падрыхтоўкі рэфератаў. Самастойная праца накіравана на фарміраванне навыкаў работы студэнтаў з літаратурай, яе падборам адпаведна тэматыцы, аналізам матэрыялу і яго прадстаўленню ў выглядзе прэзентацыі. Выкананне такога роду работы дае магчымасць студэнтам паглыбіць свае веды і выкарыстаць іх пры напісанні курсавых і дыпломных работ, навукова-даследчых артыкулаў.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў – залік.

# 2. ТЭАРЭТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## *2.1 Уводзіны*

*Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны. Прадмет вывучэння. Структура курса. Тэрміналогія дысцыпліны. Класіфіацыя рамёстваў і промыслаў. Здабыўныя промыслы. Асаблівасці мастацка-рамесніцкай дзейнасці.*

*Грамадскае аб'яднанне "Беларускі саюз майстроў народнай творчасці".*

*Сістэма мастацкіх промыслаў Беларусі. Дзяржаўны канцэрн "Белмастпромыслы". Фабрыкі мастацкіх вырабаў. Асартымент вырабаў мастацкай прамысловасці Беларусі.*

**Рамёствы і промыслы -** дробная вытворчасць, заснаваная на індывідуальнай ручной працы.

Паралельнае ўжыванне тэрмінаў "рамёствы і промыслы" адлюстроўвае поўнае ці частковае супадзенне іх прадметнага зместу, а разыходжанні звязаны з асэнсаваннем іх з пункту гледжання сацыяльна-эканамічнай характарыстыкі, сувязі з земляробствам, адносін да спажыўца.

**Рамёствы** – вытворчасць прамысловага вырабу ўручную з выкарыстаннем механічных прылад і інструментаў, майстэрства ўмелых рук (старажытна-рускае "рукамясло").

**Промыслы** – падсобная ў сельскай гаспадарцы вытворчасць, якая ўключае рамёствы і іншыя неземляробчыя заняткі. Здабыванне гатовых прыродных рэсурсаў складае першасную форму прамысловых (і наогул гаспадарчых) заняткаў і вылучаецца ў асобную групу здабыўных промыслаў:

- збіральніцтва,
- рыбалоўства,
- паляўніцтва,
- бортніцтва,
- лясныя промыслы і іншыя

**Рамяство** – першая гістарычная стадыя апрацоўчай вытворчасці, якая папярэднічала сучаснай машыннай прамысловасці. Больш выразная спецыялізацыя апрацоўчай (рамеснай) вытворчасці абумовіла яе разгалінаваную ўнутраную структуру.

Вылучаюць асобныя **рамёствы** –

- дрэваапрацоўчыя,
- металаапрацоўчыя,
- гарбарна-футравыя,
- харчовыя,
- апрацоўка мінеральнай, валакністай сыравіны,
- выраб адзення, якія ў сваю чаргу складаюцца з больш вузка спецыялізаваных.

Рамёствы і промыслы прайшлі тры стадыі, якія адлюстроўваюць іх сацыяльныя формы, -

1. дамашняга рамяства,
2. рамяства на замову
3. рамяства на рынак, або дробнай таварнай вытворчасці.

У гістарычнай і сацыяльна-эканамічнай літаратуры прадметны сэнс рамяства нярэдка абмяжоўваецца вытворчасцю на заказ, у той час як рамяство на рынак называюць саматужным промыслам, а хатняе рамяство (прадметы, прызначаныя для ўласных патрэб) – хатнім промыслам.

У феадальны перыяд амаль кожны сялянскі двор выступаў як самастойны вытворчы калектыў з шырокім дыяпазонам гаспадарчай дзейнасці. Разнастайныя жыццёва неабходныя прадметы – жыллё, харчовыя прыпасы, адзенне, тканіна, скуры, рэчы хатняга ўжытку, посуд, сельска-гаспадарчыя прылады і транспартныя сродкі – усё ў абсалютнай большасці выраблялася на месцы сваімі рукамі. Універсальны характар сялянскай гаспадаркі быў шырокай базай вытворчага вопыту і народнага ўмельства. Народная традыцыя акумулявала шматвяковыя калектыўныя навыкі і вытворчыя веды, што арганічна ўваходзіла ў нацыянальны фонд народнай культуры.

У дакапіталістычны перыяд рамёствы былі асноўнай формай прамысловай вытворчасці і адыгрывалі істотную ролю ў жыцці народа. З пашырэннем ведаў і ўдасканаленнем рамеснай тэхнікі больш выразна акрэсліліся спецыялізацыя, грамадскі падзел працы. З сельскага насельніцтва вылучаліся майстры, для якіх рамяство станавілася важнай ці нават асноўнай крыніцай існавання. Частка іх несла дваровую службу пры панскіх ці дзяржаўных (гаспадарскіх) маёнтках і манастырах. Часам двары-службы ўтваралі цэлыя пасяленні рамеснікаў пэўнай спецыяльнасці – цесляроў, бондараў, гантароў, гарбароў, ганчароў, гутнікаў, буднікаў; іх прадукцыя забяспечвала патрэбы маёнтка, прадавалася на кірмашах, збывалася за мяжу. Статуты Вялікага княства Літоўскага замацоўвалі пэўныя прывілеі для рамеснікаў, якія паводле свайго юрыдычна-прававога становішча стаялі ў феадальнай іерархіі крыху вышэй за простых сялян-земляробаў.

Частку залежных рамеснікаў феадалы сялілі ў горадзе на землях сваіх юрыдык (большасць сярэдніх і малых гарадоў Беларусі былі тады прыватнаўласніцкімі). Гарадское рамяство ў значнай ступені развівалася за кошт прытоку ў горад сельскіх майстроў. Са свайго боку яно ўплывала на развіццё і тэхнічны ўзровень сельскіх рамёстваў.

Вырабы сярэдневяковых рамеснікаў спалучалі ў сабе ўтылітарна-практычныя, эстэтычныя і сімваліка-абрадавыя функцыі і часта з'яўляліся творамі народнага мастацтва. Развіццю беларускіх рамёстваў і промыслаў, іх спецыялізацыі і арганізацыйнаму ўпарадкаванню садзейнічала магдэбургскае права.

У 17 ст. у гарадах Беларусі значылася каля 200 спецыялізаваных відаў рамёстваў і промыслаў. Найбольш пашыраны былі тыя, вырабы якіх карысталіся попытам сярод шырокіх слаёў насельніцтва:

у гарадах – кавальскае, кравецкае, шавецкае, гарбарнае, цяслярнае, ганчарнае;

у вёсках – розныя віды дрэваапрацоўкі (выраб посуду, сельска-гаспадарчых прылад, цяслярства), апрацоўка лёну і воўны, ткацтва, пляценне, здабыўныя промыслы.

Больш выразны падзел працы і актыўныя гандлёва-эканамічныя сувязі горада абумовілі паскарэнне тэхнічнага ўдасканалення і некаторыя асаблівасці сацыяльна-эканамічнай арганізацыі гарадскіх рамёстваў і промыслаў. Гарадскія рамеснікі аб'ядноўваліся ў прафесійныя арганізацыі – цэхі рамеснікаў, куды часам уваходзілі і майстры, што жылі на землях феадальных юрыдык. Спачатку такія карпарацыі называліся брацтвамі (Брэст, Гродна, Мінск, Вільня) або старостамі (Магілёў, Полацк).

Статуты розных рамесніцкіх цэхаў, асабліва на першай стадыі іх існавання, выяўлялі мясцовыя асаблівасці, што сведчыць пра іх узнікненне і развіццё на мясцовай самадзейнай аснове. Сельскае насельніцтва, якое перасялілася ў горад, прыносіла з сабой абшчынныя традыцыі. Гэтыя традыцыі складваліся ў нормы звычаёвага права і адбіваліся на паўсядзённым жыцці брацтваў. У дзейнасці брацтваў-цэхаў адлюстроўваліся сябрынныя адносіны арцельных таварыстваў, вядомых у сельскім і гарадскім рамястве яшчэ ў Старажытнай Русі.

Ваенныя падзеі Лівонскай (1558-83), руска-польскай (1654-67), Паўночнай (1700-21) войнаў істотна падарвалі асновы жыццядзейнасці беларускага этнасу і яго культуры, згубна адбіліся на развіцці народных рамёстваў і промыслаў. Дэмаграфічны спад, беднасць і галеча скарачалі попыт на рамесныя вырабы.

У 2-й палове 18 ст. пачалі адраджацца традыцыйныя рамёствы і промыслы. Асабліва хутка расла колькасць такіх рамеснікаў, як кавалі, слесары, цесляры, шаўцы, краўцы, гарбары, злотнікі.

Да 19 ст. цэхавае рамяство канчаткова вычарпала свае магчымасці. Аднак яно не знікла бясследна, а падрыхтавала глебу для больш сучасных форм вытворчасці. У гэты час побач з рамяством значна пашырылася мануфактура, якая ў асноўным функцыяніравала на базе мясцовых народных промыслаў. Нярэдка мануфактурная і саматужна-рамесніцкая вытворчасць аб'ядноўвалася ў адзінай сістэме вытворчых сувязей. Мануфактуры давалі заказы на выраб пэўнай прадукцыі майстрам-рамеснікам, якія працавалі дома, чым аб'ектыўна падтрымлівалі і стымулявалі развіццё мясцовых рамёства і промыслаў.

У 19 ст. разам з ажыццяўленнем гандлёва-эканамічных адносін прыкметна вызначылася геаграфічная спецыялізацыя сельска-гаспадарчай і саматужна-прамысловай вытворчасці.

На **Падняпроўі**, як і раней, былі шырока развіты гарбарная, ганчарная, шкляная вытворчасці, лясныя і дрэваапрацоўчыя промыслы.

У **Падзвінні** важнае эканамічнае значэнне набылі вырошчванне лёну і яго апрацоўка, рыбалоўства, суднабудаванне, каменячосны і кавальскі

промыслы, а з дрэваапрацоўкі – цяслярства. Цяслярства, апрацоўка каменю, кавальства нярэдка існавалі тут у форме адыходных промыслаў.

У **Панямонні** былі больш пашыраны вытворчасць сукна, харчовая, гарбарная вытворчасць, шавецкая і кравецкая справа.

На **Палессі** важнае месца займалі здабыўныя промыслы – рыбалоўства, бортніцтва, збіральніцтва, лесахімічны, сталярны, а з рамесных – суднабудаванне, выраб бандарнага і плецёнага посуду, апрацоўка ліпавай кары. У асобных паветах і валасцях вылучаліся вёскі ці групы вёсак, дзе асобныя промыслы развіваліся асабліва інтэнсіўна.

Рэформа 1861 узмацніла сацыяльнае расслаенне, вызваліла частку працоўных рэсурсаў для неземляробчых заняткаў і пабочных промыслаў. Частка насельніцтва ў вольны ад земляробчых работ час валіла лес і звозіла яго да рачных прыстаней і чыгунак. Многія ішлі на адыходныя промыслы на будаўнічыя, земляныя работы, працавалі цеслярамі, мулярамі, печнікамі, грабарамі, рамізнікамі, лоцманамі, сплаўшчыкамі лесу.

Ва ўмовах індустрыяльнай вытворчасці намецілася дэвальвацыя ручной працы майстра-рамесніка, што парушыла традыцыйную гармонію рамёстваў і мастацтва. Прыкметна змянялася і структура рамёстваў, іх месца ў грамадскай вытворчасці. Развіццё буйной прамысловасці абумовіла паступовае скарачэнне ткацкага, ганчарнага, экіпажнага промыслаў, звузіліся маштабы вышыўкі, набойкі, крашаніны, менш пашыранымі сталі апрацоўка ліпавай кары, выраб рагож і цыновак. Знішчэнне лясных масіваў і непамерная эксплуатацыя прыродных рэсурсаў прывялі да скарачэння пчалярства, рыбалоўства, палявання, збіральніцтва.

Аднак некаторыя рамёствы і промыслы да канца 19 – пач. 20 ст. пашырыліся, у іх ліку кравецкае, шавецкае, шапавальнае, аўчыннае, кавальскае, выраб шкла, цэглы, кафлі, а з дрэваапрацоўчых – сталярнае і цяслярнае.

Прыкметна змяніліся сацыяльны характар рамёстваў і промыслаў, іх сувязь з рынкам збыту, узаемаадносіны гарадскога і сельскага рамяства, рамяства і буйной прамысловасці. Мноства рамесных вырабаў прызначаліся заказчыкам ці прадавалася на рынку. Вытворчасць **на заказ** пераважала ў такіх рамёствах, як шавецкае, кравецкае, шапавальнае, аўчыннае, рымарскае, кавальскае, сталярнае, што перш за ўсё звязана з індывідуальнымі запатрабаваннямі і густамі. Майстры адзначаных прафесій часцей за ўсё працавалі на сыравіне заказчыка.

У ганчарстве, бондарстве, стальмашнай і такарнай справе, вырабе кошыкаў, сіт, рэшатаў, грабянёў, бёрдаў пераважала вытворчасць на рынак. Нярэдка на шляху саматужніка і пакупніка з’яўляўся скупшчык, які скупляў у майстра дома ці на кірмашы партыі рамесных вырабаў – ганчарнага і бандарнага посуду, колаў, верацёнаў, бёрдаў.

Пераважная большасць прамысловых вырабаў ішла на ўласныя патрэбы. У першыя дзесяцігоддзі 20 ст. сяляне ў вялікай колькасці ткалі для сябе ільняныя і ваўняныя тканіны, посцілкі, ручнікі, абрусы, шылі бялізну, андаракі,

фартухі, курты, світкі, рабілі паўсядзённы абутак з лыка і скуры, вязалі панчохі, рукавіцы.

Амаль кожны селянін майстраваў для сябе саху, барану, драўляныя вілы, граблі, лапаты, выдзеўбаны посуд, будаваў з удзелам аднавяскоўцаў жыллё і гаспадарчыя пабудовы.

Нярэдка больш паловы жыхароў вёскі складалі родзічы і сваякі, параднёныя праз кумаўство, што прыкметна ўплывала на характар суседскіх сувязей, грамадскі падзел працы, узаемаадносіны майстра-саматужніка і спажыўца. Сельскія майстры нярэдка задавальнялі патрэбы аднавяскоўцаў у розных рамесных вырабах на прынцыпах эквівалентнага натуральнага абмену, узаемных паслуг, адпрацовак ці проста задарма (“за дзякуй”) у знак добрых адносін.

Пераважная большасць рамёстваў і промыслаў засноўвалася на мужчынскай працы. Жаночая праца пераважала ў апрацоўцы льну, пянькі і воўны, ткацтве, вышыўцы, хатняй вытворчасці адзення, кулінарнай справе. Жанчыны і дзеці дапамагалі і ў сямейным падрадзе пры вырабе ганчарнага посуду, апрацоўцы скур і аўчыны, пляценні рыбацкіх сетак.

Арганічна звязаныя з земляробствам і жывёлагадоўлей, рамёствы і промыслы беларусаў былі зарыентаваны на **асенне-зімова-вясновы** сезон, свабодны ад сельска-гаспадарчых работ. Летам і ўвосень сяляне збіралі ягады, грыбы, лекавыя травы, нарыхтоўвалі лыка для лапцей, займаліся пчалярствам і рыбалоўствам. Некаторыя кавалі, ганчары, шаўцы, гарбары працавалі круглы год.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі саматужна-рамесная вытворчасць разглядалася як адна з форм пераходу да сацыялістычнай прамысловасці, што знаходзіла сваё ўвасабленне ў прамысловай кааперацыі.

Развіццё сельскіх промыслаў садзейнічала рацыянальнаму размеркаванню на працягу года працоўных рэсурсаў, больш поўнаму выкарыстанню таннай мясцовай сыравіны і адыходаў сельскай гаспадаркі.

У сферы грамадскай вытворчасці развіццё буйной прамысловасці гістарычна заканамерна адцясніла рамёствы і промыслы на другараднае месца. Аднак яны не зніклі, эканамічна апраўданы як падсобны промысел.

Асваенне лепшых традыцый народнага рамяства ў наш час з’яўляецца адным з асноўных кірункаў у развіцці мясцовай прамысловасці. Рамёствы і промыслы жывуць як народнае мастацтва, захаваліся і працягваюць развіццё ў народных мастацкіх промыслах і сталі неад’емнай часткай сучаснай беларускай культуры.

Рукатворныя вырабы ўмельцаў і таленавітых народных майстроў вызначаюцца

- непасрэднасцю,
- непаўторнай самабытнасцю,
- тонкім адчуваннем матэрыялу і
- эстэтычным густам і
- заўсёды былі крыніцай творчасці, адкуль чэрпала сваю сілу

беларускае прафесійнае мастацтва.

Пачатак вывучэнне народнага мастацтва Беларусі прыпадае на дарэвалюцыйны час. Пытанні народнай культуры закраналіся у этнаграфічных і фальклорных працах. У іх пераважалі апісанне розных абрадаў і звычаяў беларусаў. Увага народнаму дэкаратыуна-прыкладному мастацтву, як асобнай галіне народнай культуры, у гэтых працах не удзялялася.

Вядомы беларускі этнограф Е. Раманаў лічыу што асноўная прычына– параунаўча позняе ажыуленне беларускай этнаграфіі. Беларускія даследчыкі у першую чаргу кінуліся ратаваць вусную народную творчасць.

Аднак асобныя працы прадстаунікоў дарэвалюцыйнай этнаграфічнай навукі даюць звесткі і пра некаторыя віды мастацкай творчасці народа. Гэта работы М. Нікіфароўскага, Е. Раманава, І. Сербава, П. Шэйна, Ю. Крачкоўскага, А.Харузіна і іншых.

Далейшае вывучэнне беларускага народнага мастацтва працягвалася ў першыя паслярэвалюцыйныя гады – перыяд нацыянальна- культурнага адраджэння Беларусі. Дзякуючы шматлікім экспедыцыям па вывучэнні матэрыяльнай і духоўнай культуры народа, папаўняліся музейныя экспазіцыя новымі ўзорамі народнага мастацтва. Асабліва шырокая работа у гэтай галіне вялася інстытутам беларускай культуры. Народнае мастацтва пачало займаць раўнапраунае месца сярод іншых відау мастацтва, на яго звярнулі увагу многія даследчыкі.

Некаторыя звесткі пра народнае мастацтва заходніх тэрыторый Беларусі, якія ўваходзілі ў склад Польшчы у 1920-1930 гады, ёсць у працах даследчыкаў Польшчы. На грунтоуную работу польскага этнографа К. Машынскага, пра культуру славян, фалькларысты, этнографы, даследчыкі народнага мастацтва абапіраюцца і сёння.

Вывучэнне народнага мастацтва Беларусі працягнулася і ў пасляваенныя гады. У збіральніцкай, даследчай і музейнай дзейнасці давялося фактычна пачынаць усё спачатку, так як за гады вайны многае было страчана. У першыя пасляваеныя дзесяцігоддзі значных прац не з’явіліся, пераважалі выданні альбомнага характару.

З 2-й паловы 19 ст. віды рамёстваў і промыслаў класіфікуюцца паводле матэрыялу (метал, кераміка, шкло, косць, тэкстыль, дрэва) ці тэхнікі выканання (ліццё, чаканка, разьба, інкрустацыя, размалёўка, пляценне, вышыўка і г.д.).

Напрыклад, мастацкі тэкстыль у сябе ўключае: ткацтва, вышыўку, вязанне, габелен, маляванку.

Класіфікацыя паводле Сахута Я.М.:

- мастацкая апрацоўка дрэва (архітэктурны дэкор, бытавая разьба, скульптура, драўляная цацка);
- кераміка і ганчарства (вырабы гаспадарчага прызначэння, утылітарна-дэкаратыўная кераміка, дробная пластыка);
- кавальства (мастацкае кавальства ў народным дойлідстве, каваныя вырабы бытавога прызначэння);

- пляценне з прыродных матэрыялаў (мастацкае саломапляценне, аплікацыя саломай па дрэве і тканіне, пляценне з лазы, лучыны, кораня, вырабы з бяросты);
- выцінанка;
- роспіс (пісанкі, роспіс па дрэве, роспіс па тканіне і шкле);
- мастацкія тканіны (тканіны ўтылітарна-дэкаратыўнага прызначэння).

Рамёствы і промыслы Беларусі: аўчыннае рамяство, бондарства, будніцтва, вышыўка, гантарства, ганчарства, гарбарства, гутніцтва,здабыўныя промыслы, злотніцтва, кавальства, выраб цэглы, выраб кафлі, каменячосны промысел, кравецкае, крашаніна, лесахімічны промысел, апрацоўка ліпавай кары, набойка, пляценне, прадзенне, выраб рагож і цыновак, рымарства, слясарнае рамяство, стальмашнае рамяство, судабудаванне, вытворчасць сукна, ткацтва, цяслярства, шавецкае рамяство, шапавальнае рамяство.

Гісторыя станаўлення дзяржаўнага вытворча-гандлёвага аб'яднання "Белмастацпромыслы" непарыўна звязана з развіццём дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і народных мастацкіх промыслаў Беларусі ў XX стагоддзі. У 1919-1921 гадах былі прыняты пастановы, якія садзейнічаюць аб'яднанню майстроў у арцелі і адраджэнню народных промыслаў. У 1936 годзе быў створаны Беларускі мастацка-прамысловы саюз, які стаў папярэднікам аб'яднання "Белмастацпромыслы". У пасляваенныя гады былі арганізаваны лабараторыі і навучальныя ўстановы для развіцця і падтрымання традыцый народных промыслаў. На падставе Указа Прэзідэнта ад 5 мая 2006 года нумар 289 "Аб структуры Урада Рэспублікі Беларусь" Дзяржаўны канцэрн "Белмастацпромыслы" пераўтвораны з 1 студзеня 2007 года ў дзяржаўнае вытворча-гандлёвае аб'яднанне "Белмастацпромыслы". Выпускаемая прадукцыя:

вя столікі, канапы, крэслы, сталы), кошыкі, кошыкі для пікніка, кошыкі для бялізны, сухарніцы, цукерніцы, садавінніцы, засні, латкі, кухонныя наборы, газетніцы;

вырабы з лёну: сталовая бялізна, пасцельная бялізна, ручнікі, посцілкі, камплекты штор, сурвэткі, адзенне, сумкі, кампазіцыі для афармлення інтэр'ераў, пано, лялькі;

вырабы з дрэва: мэбля (дачныя наборы складаныя, крэслы, сталы), пано (разьба па дрэве, інкрустацыя, жывапіс), настольныя гульні (нарды, шахматы), шкатулкі, папкі, папкі-кнігі, бары, дэкаратыўныя вырабы з дрэва (зубры, алені, мядзведзі;

вырабы з саломкі: вазы падлогавыя, дэкаратыўныя кветкі, букеты вышынёй ад 10 см да 150 см, пано вышынёй ад 6 см да 150 см, дэкаратыўныя лялькі вышынёй ад 6 см да 150 см, хлебніцы, сухарніцы, фруктаўніцы, цукерніцы, шкатулкі;

вырабы з керамікі: чайныя, кававыя, сталовыя сервізы, наборы для юхі, наборы для пікніка, наборы для лазні, гаршкі, гаршкі кветкавыя, сувеніры і спартыўныя кубкі з нанясеннем лагатыпа;

вырабы з сімволікай: флагі, штандары, гербы з керамікі, гербы страчавышытыя, гербы разьбяныя з дрэва, інкруставаныя саломкай вырабу.

*Літаратура:*

1 Лабачэўская, В. А. Зберагаючы самабытнасць: З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В. А. Лабачэўская. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 375 с. : іл.
2 Этнаграфія Беларусі: энцыкл. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.

## *2.2 Кераміка і ганчарства*

*Тэхніка і тэхналогія ганчарства. Нарыхтоўка сыравіны. Ганчарны круг і яго віды. Фармоўка і абпал вырабаў. Аздабленне керамікі і памяншэнне порыстасці чарапка. Вашчэнне. Гартаванне. Дымленне. Паліваная кераміка. Фляндроўка. Асноўныя ганчарныя цэнтры. Рэгіянальныя асаблівасці керамікі. Традыцыйныя формы ганчарных вырабаў. Вырабы гаспадарчага прызначэння. Утылітарна-дэкаратыўная кераміка. Дробная пластыка. Гліняная цацка. Сучасная кераміка.*

Самыя раннія **ганчарныя вырабы** – вострадонныя, пазней кругладонныя пасудзіны – гаршкі і кубкі. З развіццём земляробства і жывёлагадоўлі вытворчасць прадуктаў харчавання павялічылася, больш разнастайнай стала ежа і спосабы яе гатавання, што абумовіла змены ў форме ганчарных вырабаў. У бронзавым веке масавае пашырэнне атрымаў плоскадонны посуд, які выраблялі ўжо ў канцы неаліту. У шырокі ўжытак увайшлі прафіляваныя гаршкі для гатавання і захоўвання ежы, міскі, кубкі. У жалезным веку ганчарныя вырабы сталі больш разнастайнымі, павялічыліся варыяцыі форм вядомых раней пасудзін, з’явіліся новыя – патэльні, кубкі з вушкамі, гаршкі з накрыўкамі. У 10-13 стст. асартымент ганчарных вырабаў шырокі: гаршкі, латушкі, карчагі (вузкагорлая), міскі, гарлачы (для захавання малака і малочных прадуктаў), галаснікі, каганцы (прыстасаванне для асвятлення памяшкання ад латка і міскі да гаршка і глячка з вузкім вусцем, напаўнялі тлушчам або алеем і апускалі кнот), цацкі.

У 19 – пач. 20 ст. ганчарныя вырабы былі вельмі разнастайнымі паводле форм і бытавога прызначэння:

- Посуд для гатавання ежы (гаршкі, бабачнікі, латкі, макатры, пражэльнікі, рынкі, цадзілкі, адстойнікі),
- Для захоўвання і транспарціроўкі прадуктаў (збаны, гарлачы, глякі, слаі, спарышы)
- Сталовы посуд (міскі, паўміскі, кубкі, хлебніцы, маслёнкі, чайнікі, імбрычкі)
- Рэчы рознага гаспадарчага ўжытку (рукамыі, паілкі, пасудзіны для гонкі дзёгцю і іншыя)

- Дэкаратыўную кераміку (фігурны посуд і скульптуру малых форм у выглядзе жывёл, букетнікі, вазоны)
- Цацкі.

**Гартаваная**: пасля абпальвання адразу загартоўвалі ахалоджваннем у абвары (рабілі ў выглядзе рэдкай рошчыны з жытняй ці пшанічнай мукі на вадзе, часта з дабаўленнем бурачнага ці капуснага расолу, дамешкам льняной ці канаплянай трасты, тоўчанага драўнянага вугалю, сажы) для павелічэння трываласці і змяншэння порыстасці (водапранікальнасці) чарапка.

**Паліваная:** пакрытая з засцерагальна-дэкаратыўнай мэтай тонкім слоем шклопадобнай палівы.

**Чорназадымленая;** чорнага колеру, часам з сінявата-чорным адценнем. Абпальванне завяршалася задымліваннем – тэрмічнай апрацоўкай без доступу паветра з выкарыстаннем смалістага паліва. У выніку ў горне або печы стваралася газавае асяроддзе з высокім утрыманне вугляроду, які ўзаемадзейнічаў з вокіслам жалеза ў гліне і афарбоўваў вырабы ў цёмны колер. Адначасова паляпшалася і іх якасць: змяншалася порыстасць і павялічвалася трываласць.

**Малочная кераміка. Малачэнне** нараджае самыя разнастайныя адценні карычневага, прадбачыць колер пры такім абпале немагчыма, кожны выраб унікальны, паколькі афарбоўка паверхні залежыць ад тлустасьці малака, працягласці вытрымкі, розьніцы тэмпературы розных частак печы. Дзякуючы сваёй дэкаратыўнасці вырабы малочнай керамікі становяцца ўпрыгожваннем любога інтэр’еру. Гэтая прыгажосць выконвае абсалютна практычную функцыю. Паколькі пасля першага (утыльнага) абпалу гліна ўсё яшчэ застаецца порыстай і можа ўпітваць ваду і рэшткі ежы, выраб дадаткова вытрымліваюць ў тлустым свежым малацэ да насычэння гліны казеінам. Пасля сушкі выраб абпальваецца паўторна. Печ мусіць быць разагрэтай да 350 градусаў, пры такой тэмпературы малако пачынае прагараць, яно застаецца ў порах, такім чынам закаркоўваючы іх. Пасля другога абпалу паверхня посуду дадаткова апрацоўваецца гарачым воскам. Гэты старажытны традыцыйны спосаб апрацоўкі гліны абсалютна экалагічны, малако не можа зашкодзіць у адрозненні ад шматлікіх глазураў, паколькі гэтае пакрыццё не мае металаў і іншых шкодных хімічных рэчываў.

**Абварная тэхналогія**. Гэта тэхналогія мае некалькі назваў: абварная, рабая і гартаваная. Мастацкай асаблівасцю абварной керамікі з’яўляецца размяшчэнне па ўсей форме вырабу рабых плям living рознага памеру, нібы на яйках курапаткі. Гартаваныя вырабы маюць непаўторны ўзор: ён можа падавацца марской пенай ці пясчаным берагам. Дэкор у абварных вырабах не дамінуе над формай, а вызначаецца гарманічным адзінствам з ёю і тым самым выклікае эстэтычную асалоду.

Асаблівасць беларускай абварной керамікі ў тым, што кожны выраб мае свій, асаблівы ўзор дэкаратыўнага пакрыцця паверхні, негледзячы на тое, што часам ў такіх вырабаў аднолькавыя сілуэты і форма. Гэта

тэхналогія гартавання посуду архістаражытная, але яна працягвае развівацца ў 21 стагоддзі.

Абварная кераміка мае шэраг сакрэтаў, якія не адразу могуць адкрыцца. Не кожная кар'ерная гліна падыдзе для вырабу абварной керамікі. Трываласць чарапка вызначае колькасць у гліне пяску і іншых дамешак.

Раней цэнтрам вытворчасці гартавання посуду была вёска Сіняўка Клецкага раёна і прылегчы да яе рэгіён. Сёння цэнтр гартаванага посуду перамясціўся ў Салігорск.

**Тэхналогія абвару**

За некалькі тыдняў да абпалу гатовых сухіх точаных ці ляпных прыбораў майстры рыхтуюць кіслую рошчыну з жытняй мукі- расол, часам дадаючы ў раствор попел і кастрыцу. Вадкасць цэдзіцца і награецца да 100°С.Тым часам праводзіцца звычайны абпал вырабаў. Калі тэмпература пачынае паніжацца з 1000-980°С да 700°С і ніжэй і агонь у печы з бялёсага ператвараецца ў чырвоны, то самая пара абцугамі ці качаргой даставаць з печы чырвоныя ад агню вырабы і апускаць іх у баўтушку. Тым часам адбываецца працэс гартавання: крухмальныя кіслыя часцінкі прыкіпаюць да паверхні чарапка. Выраб, утвараючы плямы, бывае і не вытрымлівае тэмпературнага перападу. Таму гэта тэхналогія эканамічна стратная, але вырабы атрымліваюцца экалагічна чыстыя, трывалыя і прыгожыя. Экспедыцыя У.В.Угрыновіча і М.Ф.Раманюка ў сямідзесятыя гады 20 ст. адшукалі асобных саматужных майстроў, якія ведалі сакрэты абварной керамікі.

*Літаратура:*


1. Ржавуцкі, М. С. Беларуская гліняная цацка / М. С. Ржавуцкі. – Мінск : Полымя, 1991. – 142 с. : іл.
2. Сахута, Я. М. Белорускае народнае ганчарства / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2013. – 224 с. : іл.


### *2.3 Вырабы з саломы і лазы.*

*Салома – сімвал урадлівасці ў традыцыйных народных уяўленнях. Аграрна-магічная сімволіа саламяных вырабаў. Выкарыстанне саломы ў каляндарных абрадах.*

*Аб'ёмна-прасторавыя канструкцыі. Саламяны павук.*

*Аплікацыя і інкрустацыя саломкай. Жлобінская фабрыка мастацкіх Саламяныя дываны.*

*Сучаснае мастацтва саломапляцення і лазапляцення.*

Традыцыйныя бытавыя рэчы з саломы. Царская брама – шэдэўр мастацтва беларускага саломапляцення. Падрыхтоўка матэрыяла да пляцення. Віды і спосабы пляцення з саломы. Спіральнае пляценне. Вырабы з цэльнага сцябла. Дэкаратыўна-ўтылітарныя рэчы. Галаўныя ўборы з

саломы. Сучасная саламяная пластыка. Упрыгожванні з саломы. Брэсцкая фабрыка мастацкіх вырабаў. Магілёўская фабрыка мастацкіх вырабаў. Жлобінская фабрыка мастацкіх вырабаў. Вядучыя майстры беларускай саломкі. Гаўрылюк В.І., Салдатава В.Я, Саламянка Я.П., Саламянка Г.В., Паўлоўская Т., Агафоненка Т., Арцёменка Е.Г., Главацкая Л.Г., Лось Л., Селівончык В.І., Раманеня Р. Мастацтва саломапляцення ў іншых народаў свету.

Аплікацыя саломкай. Тэхніка. Аздабленне ўтылітарна-дэкаратыўных прадметаў побыту.

Народнае беларускае мастацтва пляцення з лазы і каранёў. Тэхніка пляцення. Традыцыйныя вырабы. Пляценне з бяросты. Тэхніка пляцення. Традыцыйныя вырабы. Творчасць народных майстроў лазапляцення. Сласцён Л.А., Гурэцкая А.В.,

Зерне і салома – старажытныя сімвалы ўрадлівасці ў культуры ўсіх земляробчых народаў.

Даследаванне мастацкіх промыслаў пляцення з саломы і лазы зроблена М. Шкутам у манаграфіі " Белорусские художественные промыслы". У гэтай рабоце даецца агляд гісторыі і традыцыі народных промыслаў салома- і лазапляцення, разглядаецца галоўным чынам як галіна матэрыяльнай культуры беларусаў. Грунтоўнае даследаванне беларускага саломапляцення праведзена Лабачэўскай В.А. і апублікавана ў манаграфіях аўтара.

*Літаратура:*


1. Лабачэўская, В. А. Мастацтва дзеля славы Божай : саламяныя іканастасныя вароты і царкоўна-культавыя прадметы / В. А. Лабачэўская. – Мінск : Беларуская навука, 2018. – 263 с. : іл.
2. Лобачевская, О. А. Плетение из соломки / О. А. Лобачевская. – М. : Культура и традиции, 2000. – 208 с. : іл. Лобачевская, О. А. Белорусский народный текстиль. Художественные основы, взаимосвязи, новации / О. А. Лобачевская. – Минск : Белорусская наука, 2013. – 527 с.
3. Лобачевская, О. А. Возьми простую соломку / О. А. Лобачевская, Н. М. Кузнецова. – Минск : Белорусская наука, 2013. – 527 с. : ил.
4. Репина, Т. А. Художественные изделия из соломки: спецтехнология / Т. А. Репина. – Минск : Беларусь, 2006. – 288 с., ил.


## *2.4 Дрэваапрацоўка*

*Агульная характарыстыка дрэваапрацоўчых рамёстваў. Матэрыялы і спосабы іх апрацоўкі. Цяслярства. Сталярныя вырабы: прадметы хатняга ўжытку, прылады працы, мэбля. Стальмашнае рамяство: транспартныя сродкі, элементы коннай вупражы. Бандарства. Даўбёжнае рамяство. Такарнае рамяство.*

*Класіфікацыя разьбы па дрэву. Гранёна-выемчатая разьба. Плоскарэльефная разьба. Праразная разьба. Рэльефная разьба. Аб'ёмна-скульптурная разьба. Камбінаваная разьба. Геаметрычная разьба.*

*Сучаснае мастацтва дрэваапрацоўкі.*

**Дрэваапрацоўчыя промыслы:** цяслярства, сталярства, бандарства, стальмашнае рамяство, такарнае рамяство, разьба па дрэве, пляценне, якія ў сваю чаргу падзяляюцца на больш спецыялізаваныя заняткі.

Дрэваапрацоўчыя рамёствы найбольш старажытныя, узніклі на пачатку чалавечай гісторыі разам з вырабам прымітыўных прылад працы.

У кожную археалагічную эпоху дрэва побач з каменем, косцю, пазней жалезам было найважнейшым матэрыялам для вырабу прадметаў ужытку, зброі, разнастайных прылад.

Мэтанакіраваная дрэваапрацоўка (пляценне, адсяканне, расколванне, выдзёўбванне, заточка) вядомы з часоў палеаліту. Са з'яўленнем жалезных прылад істотна ўдасканальвалася тэхналогія дрэваапрацоўкі, якая дала пачатак цяслярству, сталярству, вырабу посуду.

З эвалюцыяй грамадства і ўдасканаленнем тэхнікі паглыблялася вытворчая спецыялізацыя, што абумовіла дыферэнцыяцыю дрэваапрацоўчых рамёстваў на адносна самастойныя вытворчыя заняткі. Так, у цяслярскай справе вылучыліся

- выраб дахавых матэрыялаў,
- будаўніцтва мастоў,
- абарончых аб'ектаў,

у сталярнай –

- выраб прыкладных элементаў жылля (дзвярэй, акон і інш.),
- мэблі,
- сельска-гаспадарчых прылад,

у стальмашным – вытворчасць рабочых вазоў, карэт, колавае, саннае, дужнае рамяство і інш.

У 17 ст. на Беларусі існавала каля 30 рамесных прафесій, звязаных з апрацоўкай дрэва.

**Мастацкая апрацоўка дрэва.**

У Беларусі, размешчанай у лясной паласе Еўропы, мастацкая апрацоўка дрэва сярод іншых відаў рамёстваў здаўна займала вядучае месца. З дрэва

- ўзводзілі жыллё і гаспадарчыя пабудовы,
- майстравалі мэблю і транспартныя сродкі,
- выраблялі прылады працы і посуд.

Спосабы апрацоўкі. Дрэва секлі, пілавалі, дзяўблі, тачылі, стругалі, свідравалі, абпальвалі, фарбавалі, таніравалі, паліравалі, лакіравалі, рэзалі, распісвалі, выпальвалі, інкрусціравалі.

Мастацтва разьбы па дрэву ўвасобілася ў

- архітэктуры народнага жылля,

- прадметах побыту,
- прыладах працы,
- посудзе,
- скульптуры.

Народны майстар пры выбары матэрыяла для будучай рэчы падыходзіў, у першую чаргу, з практычнага, ўтылітарнага боку: улічваў памер, форму і прызначэнне вырабу. Напрыклад, некаторыя выдзеўбаныя чарпакі захавалі арыгінальную сферычную форму бярозавай нарасці, у якой плоскае толькі дно. Адчуваецца разуменне прыроднага матэрыялу майстрам, чалавечыя рукі толькі падкрэсліваюць, выяўляюць, раскрываюць падказаны прыродай спосаб выкарыстання пэўнай часткі дрэва. Селянін жыў у гармоніі з прыродай, ад якой залежыў. Многія рэчы адшукваліся амаль гатовымі:

- з дуплістага ствала майстраваліся кадобчык альбо пчаліная калода,
- з дубка – цэп,
- з арэхавай рагаціны – вілы.

Такія вырабы канструктыўна моцныя, бо нідзе не перараzаліся натуральныя валокны. Яны прыгожыя непаўторнай прыроднай скульптурнасцю форм, цэласнасцю аб'ёмаў і ствараюць уражанне грунтоўнасці, вечнасці.

Надзвычай пластычныя формы беларускіх чаўноў. Іх звычайна выдзёўбвалі з тоўстай асіны, прапарвалі, распіралі бакавіны, у выніку нос і карма крыху загіналіся ўгару.

У сялянскім побыце ў шырокім ужытку былі драўляныя чарпакі. Імі веялі зерне, чэрпалі ваду, адмяралі прадукты, з іх елі, пілі, паілі хатнюю жывёлу. Функцыянальнае прызначэнне чарпакоў вызначыла іх канструктыўныя асаблівасці і адпаведнае вобразнае значэнне. Вырабы для вычэрпвання вады з лодкі і падобныя на іх веялкі нізкія, выцягнутыя, з плоскім дном і доўгай ручкай. Зерне ці вада, з сілай выкінутыя з іх, нібы працягваюць гарызантальны імклівы рух чарпака. У маленькіх коўшыках-карцах для піцця ручкі задзёртыя ўгару: так зручней чэрпаць ваду з вядра.

Шырока бытавалі драўляныя лыжкі і іх разнавіднасці – апалонікі (лыжкі большых памераў і ёмістасці). Па форме яны круглыя ці насковыя, прычым пераважалі апошнія. За многія стагоддзі свайго бытавання лыжка набыла прыгожую і зграбную скульптурную форму, якая найлепш адпавядае яе прызначэнню. Плаўны выгін тонкага плоскага чаранка, абцякальныя формы чарпака абумоўлены не толькі практычнымі, але і эстэтычнымі запатрабаваннямі. Драўлянымі лыжкамі карыстаюцца і сёння, як ў сялянскім, так і ў гарадскім побыце. Ёсць майстры-лыжкары, у спрытных руках якіх за лічаныя хвіліны асінавае паленца ператвараецца ў практычную і прыгожую рэч.

Многія формы старых выдзеўбана-разьбяных вырабаў звяртаюць на сябе ўвагу зааморфнасцю. Ручкі карцоў нагадваюць конскую ці птушыную галаву, пеўневы грэбень, птушыны хвост. Часам гэты я матывы ледзь бачныя, часам – досыць выразныя, як на карцах канца XIX – пачатку XX стагоддзя з

Мазыршчыны і Барысаўшчыны. Вельмі ярка скульптурна-заафорфнае вырашэнне выяўлена ў формах сальніц. Як і ў многіх народаў Еўропы, вырашаліся яны ў выглядзе плавучай качкі.

Наданне гаспадарчым рэчам сілуэтаў жывёл ці птушак – водгалас старажытнасці, калі такія формы выконвалі ролю абярэгаў ад нячыстай сілы. Згодна са старажытнымі павер'ямі, некаторыя свойскія жывёлы і птушкі (конь, певень, качка, каза) валодалі магічнай сілай адганяць злых духаў, і ў народзе шчыра верылі, што посуд, вырашчаны ў адпаведных формах, надзейна захавае прадукт.

Калі майстры не задавальняліся канструктыўнай і скульптурна-пластычнай выразнасцю сваіх твораў, яны дадаткова аздаблялі іх разьбяным дэкорам. На вырабах, якія пастаянна былі ў рабоце, разьба сціплая, толькі дзе-нідзе падкрэслівае тую ці іншую дэталь. Калі ж драўляная рэч займала прыкметнае месца ў інтэр'еры сялянскага жылля ці выкарыстоўвалася ў народных святах, абрадах, дэкор мог быць багацейшым. Аднак у любым выпадку ён не быў самамэтай і не перашкаджаў функцыянальнасці рэчы (утылітарнасць на першым месцы).

Разьба па дрэве — спосаб апрацоўкі драўніны з дапамогай спецыяльных інструментаў — нажа, разца, сякеры, свердла, пілы і інш.; від мастацкай разьбы. Выкарыстоўваецца пры вырабе прадметаў побыту, посуду, транспартных сродкаў, прылад працы, для упрыгожвання будынкаў, стварэння скульптур, мастацкіх вырабаў і інш.

Разгледзім найбольш пашыраныя віды беларускай народнай разьбы па дрэве.

**Трохгранна-выемчатая** – найбольш старажытны і распаўсюджаны як у беларусаў, так і ў іншых народаў від разьбы. Аснову яе складаюць трохгранныя выемкі (зубчыкі), зробленыя нажом ці простым разцом на плоскай паверхні драўлянага вырабу. Пэўным чаргаваннем зубчыкі ствараюць многія варыянты дэкору:

- у выглядзе аднабаковай ці здвоенай пілкі,
- зігзага,
- рамбічнай сеткі.

Падоўжаныя выемкі-зубчыкі ўтвараюць найбольш папулярны і даўні матыў у трохгранна-выемчатай разьбе – шматпраменны круг-разетку.

Такі характар разьбы зусім не выпадковы:

Па-першае, яна надзвычай тэхналагічная, паколькі геаметрычная разьба найлепш адпавядае прамалінейнай структуры дрэва, не патрабуючы складаных інструментаў.

Па-другое, у геаметрычных матывах зашыфраваны старажытныя ўяўленні людзей пра жыццё, прыроду, сусвет. Так, запоўненыя зубчыкамі квадраты, прамавугольнікі, ромбы нібыта абазначаюць засеянае поле. Шматпраменны круг-разетка – сімвал сонца.

Дэкаратыўная трохгранна-выемчатая разьба звычайна сустракаецца на прадметах, звязаных з жаночай працай. Перш за ўсё прадзеннем і ткацтвам.

Часцей за ўсё яе можна пабачыць на прасніцах, якія часта былі падарунам. Аздобленыя разьбой прасніцы на Беларусі не так распаўсюджаны, як на паўночнарускіх тэрыторыях ці ў карпацкім рэгіёне.

**Рэльефная разьба**, якая мае заглыблены фон і ўзнятыя над ім формы дэкору, - з'ява ў беларускім народным побыце мала характэрая. Можна ўзгадаць дошкі-формы для друкавання фігурнага пячэння (пернікаў) і ўзораў на тканіне (набойкі).

Пернікавыя дошкі выразалія ў тэхніцы так званага контррэльефу, г.зн. малюнак не выступаў над фонам, а заглыбляўся ў яго, каб потым можна было з кавалка цеста адціснуць фігурны пернік. Сюжэты самыя розныя, у большасці старажытныя: конь, певень, каза, рыба,чалавек.

Набоечныя дошкі-штампы мелі плоскі рэльеф, які намазвалі фарбай, а потым друкавалі ўзор на кавалку палатна. Набоечны промысел бытаваў нават пасля вайны, калі па вёсках хадзілі вандроўныя майстры-набівальшчыкі з цэлым камплектам штампаў, аздабляючы друкаванымі ўзорамі ручнікі, накідкі, падузорнікі, фіранкі. Плоска-рэльефны ўзор уключае кветкі (цюльпаны, васількі, ружы), травы, распаўсюджаны былі і геаметрычныя матывы (у клетачку, у канапельку, зоркай). На позніх дошках разьбяны рэльеф нярэдка дапаўнаўся цвічкамі і металічнымі пласцінкамі, якія пры друкаванні давалі кропачкі і палоскі. Узор, аддрукаваны на палатне з такіх дошак, хоць і з'яўляецца сціплым у дэкаратыўных адносінах, усё ж вызначаецца непаўторнай прыгажосцю і прывабнасцю.

**Скразной разьбой (прапілоўкай)** звычайна аздабляецца жыллё. На дошку наносіцца пэўны малюнак, які затым выпілоўваецца пілкай з вузкім палатном (лобзікам). Атрымліваецца ажурны ўзор, які асабліва эфектна глядзіцца на прасвет. Такімі карункамі аздабляюць

- вокны,
- карнізы,
- закрыліны,
- ганкі і інш. Часткі жылля як у Беларусі, так і ў Расіі, Прыбалтыцы, на поўначы Украіны.

На Беларусі мы не сустрэнем ні манументальнасці і велічы разьбянога дэкору рускай Поўначы, ні адмысловай узорыстасці жылля Паволжа. Разьба больш сціплая, формы абагульненыя і выяўляюць імкненне да скульптурнасці. Часам разьба, асабліва на захадзе Беларусі, у чыстым выглядзе і ўвогуле адсутнічае, мастацкае аблічча пабудовы ствараецца за кошт канструктыўна-пластычных сродкаў. Такая ж асаблівасць вызначае архітэктурны дэкор жылля заходніх славян – палякаў, чэхаў, славакаў.

**Аб'ёмная (скульптурная)**. У шырокім сэнсе слова сюды можна аднесці ўсе драўляныя вырабы, асабліва выдзеўбаныя:

- ступы,
- начоўкі,
- чаўны,
- вуллі,

- бочкі,
- чарпакі,
- лыжкі,
- сальніцы.

**Бо́ндарства** — рамяство па вырабу ёмістасцей і посуду з драўляных клёпак.

Бондарства вядома са старажытных часоў. Клёпкі, ўяўляючыя сабой трапецападобныя або выгнутыя падоўжаныя планкі, выраблялі з дапамогай струга, гэбля і гэбліка. Для надання ім увагнутага профілю выкарыстоўвалі скоблі і шархебель. Форму клёпак і бакавы авал вырабу пры зборцы правяралі з дапамогай шаблонаў (модлаў).

Шаблоны (модлы) розных памераў Затор

Абручы выраблялісяз ляшчыны, дуба і іншых парод дрэваў з дапамогай струга і нажа. Таксама ўжываліся абручы з металу (жалезныя абручы, злучаныя ў кола заклёпкамі). Абручы гнуліся непасрэдна на вырабе або на спецыяльным прыстасаванні — гбале (бабе). Днішча збіралася з дошак і размячалася цыркулем.

Уторны паз для мацавання днішчаў выпілоўваўся спецыяльным інструментам — заторам. У бандарнай справе таксама выкарыстоўваліся і іншыя інструменты і прыстасаванні (нацягуша, чакухі, вяроўкі, ланцугі, кліны і інш.)

У залежнасці ад мясцовых умоў і традыцый і прызначэння бандарных вырабаў, для іх вырабу выкарыстоўвалася драўніна розных парод дрэваў (дуб, елка, асіна, вольха і інш.).

Банда́рныя вы́рабы — драўляныя ёмістасці і посуд, выраблены з драўляных клёпак для вадкіх і сыпучых рэчываў, бытавых патрэб.

Па форме клёпак, якія могуць быць падоўжанымі трапецападобнымі і акруглымі выпуклымі, магчыма падзяліць на

- кадзепадобныя (канічнай формы),
- бачарныя (пукатыя).

Паводле прызначэння:

- ёмістасці для вады і вадкасцей — транспартная бочка, кадушка, вядро, біклага, барылка, конаўка;
- ёмістасці для сельскагаспадарчых прадуктаў — кадзь, бочка, бачурка, кубелец;
- ёмістасці для бытавых патрэб — кубел, жлукта, цэбар, дзяжа, бойка, бельчык, ражка і інш.;
- меры ёмістасці — карэц, гарнец, асьміна.

Некаторыя бандарныя вырабы аздабляліся разьбой, размалёўкай, выпальваннем.

У сучаснасці месца большасці драўляных бандарных вырабаў занялі ёмістасці з металу, пластмас, шкла, фарфору і інш.

*Літаратура:*

1. Белорусы Москвы. XVII век / сост. О. Д. Баженова, Т. В. Белова. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2013. – 472 с. : ил.

3 Сахута, Я. М. Беларускае народнае мастацтва / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2011. – 367 с. : іл.

2. Сахута, Я. М. Беларускі народны архітэктурны дэкор / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2020. – 224 с. : іл.

3. Сергачёв, С. А. Народное зодчество Беларуси. История и современность / С. А. Сергачёв. – Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2015. – 560 с. : іл.

4. Сялянская энцыклапедыя ў творах Мікалая Тарасюка: альбом-манаграфія / аўтар тэксту і ўкладальнік В. Лабачэўская; фотамастак Г. Ліхтаровіч. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2008. – 176 с., іл.

## *2.5 Роспіс*

*Народны мастацкі роспіс. Маляванка.Матэрыялы і тэхнічныя прыёмы. Сфера выкарыстання мастацкага роспісу: мэбля, транспартныя сродкі, рэчы побытавага і абрадавага прызначэння.*

*Пісанка. Спосабы дэкарыравання. Васкаванне, гравіраванне. Набіванка. Інструменты і тэхналогія. Дошкі-клішэ.*

*Роспіс па шкле. Час бытавання і прызначэнне. Тэматыка і характар малюнка. Тэхналогія выканання.*

*Сучасны стан развіцця рамяства. Дэкаратыўны жывапіс.*

Пісанкі. Шкрабанкі. Капанкі. Тэхніка “тычком”. Тэхніка “леечкай”. Народныя майстры. Хачкова В., Клімовіч Г., Вакульчык М. Чорна-белыя пісанкі Сапоцкіна.

Аздабленне куфраў. Фляндроўка. Цацкаванне. Кампазіцыя дэкору. Тэхналогія нанясення фарбы.

Роспіс па тканіне. Маляваныя дываны. Творчасць Кіш А., Сухавілы Ф., Ючковіч Л. Маляваныя дываны ў творчасці прафесійных мастакоў.

Роспіс па шкле. Рэгіёны бытавання. Сюжэт і кампазіцыя. Фотарамкі.

Маляваныя дываны - адзін з відаў выяўленчай творчасці. Актыўнае развіццё дадзенага віду мастацтва ў Беларусі прыпадае на перыяд 1930-1950 гадоў, хаця маляваныя дываны ў Беларусі ствараліся не толькі ў гэты час. Іншая справа, што маляваныя дываны на паперы, цыраце, тканіне не маглі доўга захоўвацца, і таму іх даўнейшыя ўзоры не дайшлі да нашага часу.

Спрадвеку людзі марылі пра лепшае жыццё, якое бачылася райскім садам, напоўненым белымі лебядзямі, добрымі ільвамі, з бярозавымі пальмамі, на галінках якіх спяваюць заморскія птушкі.

У 1940 - 50- я гады XX стагоддзя набіўныя і маляваныя дываны былі амаль што ў кожнай сялянскай хаце. Яны ў масавым парадку прадаваліся на рынках. Мастакі хадзілі па вёсках, кватаравалі ў вяскоўцаў, бралі заказы,

малявалі і набівалі дываны. Людзі ішлі да мастака з вялікімі і маленькімі скруткамі крамнога ці саматканага адбеленага палатна, каб праз пэўны час атрымаць ужо твор з пышнымі букетамі разнастайных кветак і ідылічнымі пейзажнымі ці сюжэтнымі замалёўкамі.

Такім мастацтвам займаліся не толькі вандроўныя творцы. У вёсках і буйных мястэчках жылі і працавалі (а многіх з іх і сёння можна адшукаць у Беларусі) мастакі-жывапісцы, якія выконвалі заказы, як кажуць, на даму. Попыт на такую мастацкую прадукцыю быў вялікі, і таму гэты від народнага мастацтва развіваўся ў плыні натуральнай і штодзённай у ім патрэбы. Маляваныя дываны з'яўляліся не толькі бытавымі ўтылітарнымі рэчамі ў гаспадарцы. Яны станавіліся неад'емным прадметам эстэтызацыі інтэр'ера пакояў, сродкам далучэння да духоўных крыніц чалавечага жыцця.

Сюжэтна-тэматычныя маляваныя дываны, як правіла, прасякнуты жыццесцвярджальным аптымізмам, пэўнай эпічнай абагульненасцю, іх характарызуюць душэўная адкрытасць і наіўная, шчырая непасрэднасць. Тут назіраюцца своеасаблівая кананізацыя ў прадметна-кампазіцыйным вырашэнні, выяўленчы лаканізм у адлюстраванні таго ці іншага дзеяння. Каб надаць твору эстэтычную завершанасць, у большасці выпадкаў структура кампазіцыі будуецца ў спалучэнні жывапісна-станковых і чыста дэкаратыўных элементаў. У цэнтры дывана адлюстроўваецца сюжэт ці краявід, а па перыметры аздабляецца бардзюрам рознакаляровых кветак. Майстры-размалёўшчыкі, усё жыццё якіх праходзіла ў вёсцы, у звычных умовах нашага беларускага клімату, малявалі на палотнах заморскіх звяроў, птушак, адлюстроўвалі раслінны свет, не падобны на наш, сярэднееўрапейскі. Вядома ж, гэтыя мастакі ніколі не бачылі ні тыграў, ні паўлінаў і нават аленяў у натуральных умовах іх існавання, але намаляваныя прадстаўнікі жывёльнага свету становіліся аб'ектам пераканаўчага вобразнага перажывання і пераасэнсавання мастака. Менавіта імкненне занатаваць незвычайныя сцэны ірэальнага жыцця, сумясціць магчымае і немагчымае ў змесце карціны давала магчымасць творцу ўзняцца над звыклым мірскім быццём і ўбачыць жыццёвую сутнасць у непарушнай гармоніі дабрыні, радасці, прыгажосці і бязмежнай асалоды ад квітнеючых у цёплым сонечным святле райскіх куточкаў прыроды. Гэта той жыватворны праменьчык, які будзіць самыя высакародныя пачуцці, напаўняе чалавечую істоту ўзнёслым настроем, асобай прагай жыцця.

Адметнай у народным дэкаратыўным жывапісе з'яўляецца творчасць **Алены Кіш**. Невялікая колькасць захаваных да нашых дзён яе мастацкіх твораў - узор народнага дэкаратыўнага жывапісу, дзе яскрава спалучаюцца своеасаблівая форма эстэтычнага ўспрымання і вобразнага асэнсавання матэрыяльнага свету, філасофскія думкі аб прыгажосці ў суладдзі рэальнага і таго нерэальнага, што існуе толькі ва ўяўленнях, фантазіі і снах чалавека. Маляваныя дываны Алены Кіш - гэта яскравы сінтэз шматлікіх кампанентаў народнай мастацкай культуры ў жывапісе, неад'емнай часткай якіх

з'яўляюцца глыбокае пранікненне ў сутнасць падзеі ці з'явы, своеасаблівае вобразнае абагульненне герояў кампазіцыі, абвостраная сімволіка-алегарычная іх матывацыя, высокая ступень дэкаратывізму і каларыстычная цэльнасць твора, што заўсёды падтрымліваецца абмежаванай палітрай фарбаў з плоскаснай іх размалёўкай у жывапісным палатне. У творах народнай мастачкі са Случчыны спалучаюцца арнаментальны дэкаратывізм і сюжэтна-тэматычная рэпрэзентатыўнасць. Асноўнае месца ўсё ж у яе працы займаюць кампазіцыйныя распрацоўкі анімалістычнага зместу, хаця вобразу чалавека тут надаецца асобная роля. Чалавек, прырода, жывёльны свет выступаюць у дыванах Алены Кіш у гарманічным узаемадзеянні, у атмасферы той ідыліі, дзе ўсё прыгожа, размерана, дзе пануюць дабрыня, цудоўны настрой, гармонія жывога і неадухоўленага свету.

Мы разгледзелі толькі некаторыя асаблівасці, якія маюць пэўныя адносіны да магчымых вытокаў фарміравання таленту выдатнай народнай мастачкі. Па-свойму яна асэнсоўвае такія паняцці, як кампазіцыйная структура, вобразнае і каларыстычнае вырашэнне, стылізацыя і дэкаратыўна-пластычная арганізацыя маляванага дывана. Усе дываны Алены Кіш, якія захаваліся да нашага часу, маюць, як ужо адзначалася, арнаментальна-дэкаратыўную і сюжэтна-тэматычную кампазіцыйную пабудову палатна. Па перыметры дывана мастачка маляўніча "сплятае" гірлянды стылізаваных кветак, лісцяў і сцяблінкаў на цёмным (чорным або сінім) фоне, а ў цэнтры палатна разгортвае кампазіцыю з любімымі яе героямі: львамі, тыграмі, аленямі, птушкамі ў суквецці казачнага расліннага свету. Назвы яе дываноў адлюстроўваюць іх змест, напрыклад: "Рай", "Ліст да каханага", "Дзева на водах", "У райскім садзе" і інш. Палотны "Рай", "У райскім садзе" і "Ліст да каханага" маюць шматлікія варыянты і кампазіцыйныя інтэрпрэтацыі. Гэта тлумачыцца, напэўна, тым, што Алена Кіш, вандруючы па вёсках і стваараючы маляваныя дываны, захоўвала пэўныя ўстойлівыя назвы сваіх твораў, але ніколі не паўтарала наступны твор на ўзроўні ідэнтычнай копіі папярэдняга.

У маляваным дыване "Рай" мастачка віртуозна мадэліруе на пярэднім плане вобразы льва і тыгра, якія быццам адкрываюць від на казачную прыроду з раслінным і жывёльным светам. Тут у густых зараслях відаць постаць аленя, на дрэвах утульна ўладкаваліся птушкі, падобныя на горных ястрабаў, пад імі іскрыцца гладзь азёрнай вады. Аўтар у гэтым палатне, як і шматлікіх іншых, не карыстаецца законамі лінейнай і прасторавай перспектывы, правіламі прапарцыянальных суадносін прадметаў, а вырашае кампазіцыю ў плоскаснай, графічнай манеры. Кожная дэталь тут мае самастойнае сэнсавае значэнне і выконвае ролю канкрэтнага сімвала, атаясамляючыся з паняццямі дабрыні, сілы, прыгажосці, вернасці і інш. Прадстаўнікі жывёльнага свету, так па-майстэрску стылізаваныя мастачкай, маюць асаблівую абаяльнасць і прыгажосць. Яны не толькі бачацца нам добрымі, лагоднымі, але і ачалавечанымі, быццам надзеленымі пачуццямі і інтэлектуальнымі здольнасцямі. Вобразы льва і тыгра сімвалізуюць сілу, магутнасць і

надзейнасць, а птушкі выступаюць ахоўнікамі зямнога багацця і прыгажосці пад цёплымі промнямі сонца. У разуменні мастачкі рай аса- цыіруецца з той прыгажосцю ў прыродзе, якую яна і імкнулася адлюстраваць у сваіх творах, з гармоніяй і суладдзем жывой і неадухоўленай матэрыі. Вобразы львоў і іншых экзатычных жывёл, якія сустракаюцца не толькі ў жывапісных формах народнай творчасці, але і ў ткацтве, вышыўцы, аб'ёмнай пластыцы, з'ява невыпадковая. Яна ідзе з перыяду XVII-XVIII стст. і закранае пытанні кантактаў народаў Рэчы Паспалітай з культурай народаў Усходу, узаемаадносін вясковага і гарадскога мастацтва. Менавіта з сярэдзіны XVII стагоддзя беларускія мастацкія промыслы ўспрынялі плынь у мастацтве, якая вядома пад назвай "сарматызм".

У перыяд існавання Рэчы Паспалітай, у склад якой уваходзілі землі Беларусі, існавалі трывалыя эканамічныя і культурныя сувязі з Усходам, актыўна вёўся гандаль. Шмат чаго прывозілася з краін ісламa, асабліва рэчы штодзённага ўжытку, упрыгажэнні, прадметы мастацтва. Усё гэта адаптавалася ў сацыяльным асяроддзі беларусаў і нярэдка аказвала ўплыў на развіццё народнай творчасці.

У старажытныя часы, напрыклад у міфалогіі краін Усходу, леў лічыўся важным бажаством і асацыіраваўся з магутнай сілай і лютасцю. Але калі гэта істота набывала канкрэтныя вобразы ў творчасці нашых продкаў, яна ўжо страчвала рысы страшнага драпежніка і пераўвасаблялася ў добрага магутнага звера.

Вобразы драпежнікаў нашы продкі ў мінулым і народныя творцы ў больш позні перыяд перапрацоўвалі ў сімвалы зусім іншага кшталту - фальклорных герояў, якія ўвасаблялі сілу, мужнасць, дабрыню, высакароднасць.

Творчасць Алены Кіш у маляваных дыванах развівалася ў рэчышчы жыццёвых патрэб на вырабляемую ёю мастацкую прадукцыю. Гаспадары большасці сялянскіх хат імкнуліся эстэтызаваць жыллёвае асяроддзе насценнымі дыванамі і таму заказвалі іх мастачцы. Яна працавала непасрэдна ў хаце заказчыка, разгортвала сваю небагатую паходную майстэрню і малявала хутка, упэўнена, бездакорна. Гледачы па-рознаму ўспрымалі мастацтва Алены Кіш. Большасць з іх з захапленнем выказвалі сваё ўражанне, любаваліся прыгажосцю казачных пейзажаў з грознымі і разам з тым добрымі звярамі, птушкамі; іншыя разглядалі твор з ледзь прыметнай усмешкай (маўляў, усё не так, як у рэальнасці), але адно аб'ядноўвала ў ацэнцы яе твораў — гэта тое, што яны не пакідалі абыякавымі нікога.

Да нашага часу няшмат захавалася насценных маляваных дываноў Алены Кіш. Частка іх знаходзіцца ў фондах Заслаўскага гістарычнага музея, некаторыя - у прыватных калекцыях беларускіх мастакоў. Мы з упэўненасцю можам сказаць, што яны ўяўляюць унікальную і багатую спадчыну народнай мастацкай культуры, непаўторны ўзор народнага роспісу як па знешне канструктыўным вырашэнні, так і па сімволіка-вобразным і філасофскім вытлумачэнні карціны Свету.

*Літараура:*

1. Беларускія маляваныя дываны: альбом-каталог з фондаў гісторыка-культурнага музея-запаведніка “Заслаўе”. – Мінск : Рыфтур, 2005. – 64 с.
2. Сахута, Я. М. Беларускае народнае мастацтва / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2011. – 367 с. : іл.

### *2.6 Апрацоўка металаў*

*Металы і асноўныя спосабы іх апрацоўкі.*

*Кавальства ў народным побыце. Віды кавальскіх вырабаў. Здабыванне і апрацоўка сыравіны. Кузня і яе абсталяванне. Традыцыйныя тэхнікі і тэхналогіі. Інструменты і матэрыялы. Асноўныя тэхналагічныя працэсы. Медніцтва. Злотніцтва.*

*Сучаснае мастацкае кавальства.*

**Кавальства** – вытворчасць вырабаў гаспадарчага і дэкаратыўна-прыкладнога прызначэння з жалеза шляхам яго гарачага ці халоднага кавання. На Беларусі вядома з часоў жалезнага веку. Жалеза здабывалі з балотнай руды ў невялікіх паўшарападобных печах (домніцах), з атрыманых загатовак (крыц) выкоўвалі наканечнікі коп’яў, нажы, долаты, конскую збрую, упрыгожанні і інш. Пашырылася ў 11 – 13 ст.

З жалеза выкоўвалі рэчы гаспадарчага і бытавога прызначэння: сякеры, долаты, нажы, нажніцы, свярдзёлкі, зубілы, шпоры, коп’і, цвікі, крэсівы, замкі, ключы, спражкі, фібулы і інш.

Кавальствам звычайна займаліся гарадскія рамеснікі, якія валодалі таксама загартоўкай, цэментацыяй, зваркай.

У 16 ст. узніклі першыя кавальскія цэхі (Слуцк, Полацк, Магілёў, Віцебск і інш.), якія аб’ядноўваліся разам з іншымі (гал. чынам слясарнымі) ці выдзяляліся ў самастоўныя. Уставы кавальскіх цэхаў рэгламентавалі характар работы кавалёў: акоўванне транспартных сродкаў, падкоўванне коней, выраб сякер, крукоў, шлемаў, якараў, ланцугоў, рашотак, а таксама розных рэчаў мастацкага характару.

Асаблівага развіцця дасягнула кавальства ў 17-18 ст. У Віцебску, Полацку, Мінску, Магілёве, Пінску, Гродне налічваліся дзесяткі кавалёў розных спецыяльнасцей: нажоўшчыкаў, мечнікаў, замочнікаў, кацельшчыкаў і інш.

Пераважная большасць гарадскіх майстроў працавала ў сферы манументальнага будаўніцтва. Яны выраблялі агароджы, балконы, лесвічныя парэнчы, алтарныя перагародкі, крыжы, флюгеры і інш. Многія беларускія майстры-кавалі працавалі ў Маскоўскай дзяржаве. У 19 ст. з развіццём прамысловасці кавальства ў гарадах заняпала, адначасова ўзрастала яго роля ў

вёсцы, дзе яно задавальняла галоўным чынам бытавыя і гаспадарчыя патрэбы навакольнага насельніцтва. Для кавальскіх работ будавалі асобнае памяшканне – кузню, у якой былі горан і неабходныя кавальскія інструменты. Вугаль (з лісцевых парод дрэў) набывалі на смалакурнях ці выпальвалі самі, жадеза выкарыстоўвалася ў выглядзе заводскага фасоннага пракату (шыннае, падкоўнае і інш.) ці рознага жалезнага лому. Асноўныя віды работ:

- акоўка транспартных сродкаў (калёс, саней, брычак, вазкоў) і выраб металічных дэталей да іх,
- падкоўванне коней,
- выраб сельскагаспадарчага інвентару (сярпы, сашнікі, матыкі, драпашкі),
- слясарнага і сталярнага інструменту (сякеры, свярдзёлкі, стругі, долаты, скоблі),
- прыладаў хатняга ўжытку (секачы, качэргі, вілкі, багры, бязмены, крэсівы),
- дэталяў аснашчэння жылля і мэблі (завесы, клямкі, замкі, крукі, зашчэпкі, краты) і інш.

Для выкоўвання патрэбнага вырабу жалезную загатоўку награвалі ў горне дачырвана (для надання металу пластычнасці) і, паклаўшы яе на кавадла, ударамі малатка выкоўвалі з яе патрэбную форму. У залежнасці ад прызначэння вырабаў іх тэрмічна апрацоўвалі – цэментавалі (насычалі паверхневы слой вугляродам, што надавала вырабам павышаную цвёрдасць і трываласць), загартоўвалі (награвалі і хутка ахалоджвалі ў вадзе для надання цвёрдасці, пругкасці) і адпускалі (награвалі і паступова ахалоджвалі, што змякчала дзеянне загартоўкі, змяншала крохкасць і павышала пластычнасць).

Асноўным спосабам нераздымнага злучэння загатовак ці асобных частак у адзінае цэлае (напр., зламанай восі) была кавальская зварка. Канцы загатовак награвалі дабяла і пасыпалі іх рачным пяском (каб прадухіліць утварэнне акаліны), потым стыкоўвалі ў адзінае цэлае моцнымі ўдарамі малатка. Зварка ўжывалася і для спалучэння жалеза са сталлю (пры вырабе сярпоў, нажоў, сякер, зубілаў і інш.): да жалезнай асновы (спінка, абушок) прыварвалі стальное лязо ці ўварвалі яго паміж дзвюма жалезнымі пласцінамі (настальвалі), што надавала вастрыю ляза неабходную цвёрдасць, а яго крохкасць кампенсавалася пластычнасцю жалезнай спінкі ці бакавін.

Для нераздымнага злучэння частак ужывалі таксама кляпанне: у прыбітыя ці прісвідраваныя адтуліны ўстаўлялі металічны стрыжань (заклёпку), крыху даўжэйшы за агульную таўшчыню злучаемых частак, яго канцы раскёпвалі, надзейна замацоўваючы дэталі.

Злучэнне хамуцікам прымянялася звычайна пры вырабе рэчаў дэкаратыўна-прыкладнога характару: дзве дэталі (напр., звенні агароджы) у месцы стыкоўкі абкручвалі металічнай скобкай (часам – два, тры разы), якую ўдарамі малатка абціскалі вакол загатовак.

Раздымныя злучэнні рабілі з дапамогай шрубаў.

Існавалі іншыя спосабы кавальскай апрацоўкі вырабаў: усадка – павелічэнне папярочнага сячэння загатоўкі па ўсёй даўжыні з адначасовым яе скарачэннем (малатком білі па канцы разагрэтай загатоўкі, пастаўленай другім канцом на кавадла); высадка – патаўшчэнне пэўнай часткі загатоўкі (выконваецца такім жа чынам, але награваецца не па ўсёй даўжыні, а ў адпаведным месцы); тарсіраванне – скручванне гранёнага стрыжня вакол восі для ўтварэння вінтападобнай загатоўкі; рассяканне загатоўкі зубілам з наступным адгінаннем адгалінаванняў да пэўнай формы і інш.

Разнастайнае спалучэнне тэхналагічных прыёмаў дазваляла ствараць не толькі ўтылітарныя, але і дэкаратыўна-мастацкія вырабы складанай канструкцыі і малюнку. Так, напр., асноўны від дэкору каваных агароджаў, варот, балконаў – спалучэнні S- і C-падобных завіткоў, скручванне жалезных прутоў вакол падоўжанай восі, арнаментальныя матывы ў выглядзе разетак, бегункоў, меандру, картушаў; накладкі на мэблі і дзвярах аздаблялі прасечкай, гравіроўкай, насечкай ў выглядзе геаметрычных узораў; дробныя каваныя вырабы дэкарыравалі ўзорамі з кропак, ямак, крыжыкаў, зорачак, выбітых адпаведнымі штампамі.

У наш час кавальства ў сваім традыцыйным выглядзе захавалася пры калгасных і саўгасных майстэрнях, дзе з'яўляецца дапаможнай металаапрацоўчай спецыяльнасцю пры рамонце сельскагаспадарчага інвентару, абслугоўвання бытавых патрэб насельніцтва. Звычайна кавальства спалучаецца з газа- і электразваркай. На заводах у кавальскіх цэхах асноўныя працэсы механізаваны. У 60-80-яя гг. Адраджаецца ручное мастацкае кавальства для аздаблення грамадскіх інтэр'ераў, рэстаўрацыі старой забудовы і інш.

Адно з найстаражытных рамёстваў на тэрыторыі Беларусі, узнікненне якога звязана з вынаходніцтвам выплаўкі жалеза з мясцовай балотнай руды.

Вытворчасць жалеза дала назву цэлай археалагічнай эпохе – жалезнаму веку (7-6 ст. да н.э. – 8 ст. н.э.). Першыя з жалезам пазнаёміліся плямёны мілаградскай культуры, расселеныя ў басейне Прыпяці, на Сярэднім і Верхнім Падняпроўі (7-3 ст. да н.э.). Праз 1-2 стагоддзі яно стала вядома плямёнам цэнтральнай і паўночнай Беларусі (культуры штрыхаванай керамікі і днепра-дзвінская).

Мяркуючы па знойдзеных вырабах, кавалі былі знаёмы з такімі спосабамі апрацоўкі жалеза, як загартоўка, цэментацыя, зварка. Шырокі быў і асартымент вырабаў, стваралі прылады працы: нажы, сякеры, сярпы, долаты, малаткі, прабойнікі, напільнікі, прадметы бытавога і гаспадарчага прызначэння, рыбалоўныя кручкі

**Медніцтва.** Тэхніка вырабу гаспадарчых і мастацкіх рэчаў з медзі. Вядома ў краінах Старажытнага Усходу з 4-га тысячагоддзя да н.э., у Еўропе – з 3-га тысячагоддзя да н.э.

На Беларусі вытворчасць мастацкіх вырабаў з прывазной медзі і яе сплаваў (дыядэмы, бранзалеты, пярсцёнкі, спражкі і нш.) вядома з часоў бронзавага веку. Росквіту дасягнула ў 17-18 ст. У многіх гарадах і мястэчках

працавалі майстры-меднікі і катляры, якія з прывазной ліставой медзі выраблялі разнастайны літургічны і гаспадарчы посуд:6 тазы, падносы, чайнікі, кварты, чашы, каўшы, блюды, кубкі і інш.

У сяр. 17 ст. бел. майстры (Ф.Мікулаеў, М.Сямёнаў і інш.) працавалі ў Рус. дзяржаве, дзе выраблялі для маскоўскіх храмаў і царскага двара царк. і гасп. начынне.

Тэхніка і віды мастацкай апрацоўкі медзі разнастайныя:

- выкалатка,
- паліроўка,
- паянне,
- чаканка,
- гравіраванне арнаментальных (раслінных, зааморфных) і сюжэтна-тэматычных кампазіцый.

Вялікіх памераў тазы, падносы, жароўні выцягваліся з аднаго кавалка медзі. Пасудзіны больш складаных форм выраблялі з дапамогай спец. Прыстасаванняў: у цісках мацавалі спружыністы рычаг, другі канец якога ўстаўлялі ўнутр пасудзіны; стукаючы малатком па рычагу, яго канцом выбівалі патрэбную форму. Унутры пасудзіну лудзілі.

У канцы 18 – 19 ст. медніцтвам займаліся майстры некаторых рудняў на Гомельшчыне, Гродзеншчыне і інш. Медніцтва таго часу вызначался своеасаблівым спалучэннем усходніх форм з традыцыйнымі мясцовымі. Глякі, тазы, кварты, дайніцы, збаны, вёдры, блізкія па форме аналагічнаму глінянаму і драўлянаму посуду, былі пашыраны пераважна ў абыходку мяшчан.

Асноўны від дэкаратыўна-мастацкага аздаблення вырабаў – фактурная апрацоўка паверхні, што давала прыгожае зіхаценне..

У пач. 20 ст. медніцтва заняпала.

*Літараура:*

1. Сахута, Я. М. Белорускае народнае кавальства / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2015. – 174 с. : іл.

### *2.7 Тэкстыльныя рамёствы і промыслы.*

*Разнастайнасць прыёмаў работы з традыцыйнымі тэкстыльнымі матэрыяламі. Рацыянальнасць работы. Улік якасцей матэрыялу і прызначэння вырабу. Характар дэкору. Тэхналогія выканання. Сучаснае тэкстыльнае мастацтва.*

*Этапы работы над вырабам. Аналіз традыцыйнай тэхналогіі вырабу тэкстыльных прадметаў. Эскіз. Этапнасць выканання. Падбор матэрыялаў і абсталявання. Выкананне пробы ў матэрыяле. Прыёмы афармлення вырабу.*

*Літаратура:*

1. Лобачевская, О. А. Белорусский народный текстиль : художественные основы, взаимосвязи, новации / О. А. Лобачевская. – Минск : Беларуская навука, 2013. – 527 с. : ил.
2. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. - Мінск : Бел. навука, 2001 -2013. – 6 т.

### *2.7.1 Беларускі традыцыйны строй. Асноўныя элементы касцюма.*

*Народны строй. Рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці строяў. Гендэрныя, саслоўныя, узроставыя асаблівасці адзення. Традыцыйныя колеры, кампазіцыя, прапорцыі. Сыравіна, крой, аздабленне, спосаб нашэння.*

*Традыцыйны жаночы комплекс. Мужчынскі касцюм. Верхняе адзенне. Абутак. Упрыгожванні. Традыцыйныя і сучасныя матэрыялы і інструменты.*

*Мужчынскі народны касцюм. Плечавое адзенне.*

**Армяк –** сшыты з армячыны сялянскі кафтан прамога крою, неадразны па лініі таліі, без зборак. У XIXст. – верхняе сялянскае адзенне прамога крою з сукна.

**Бекеша** – з часоў Стэфана Баторыя так называлася моднае верхняе мужчынскае адзенне “венгерскім кроем”, распаўсюджанае сярод шляхты. Названа па прозвішчу Каспера Бекеша, венгерскага магната, які служыў Польшчы. Атрымала распаўсюджанне на тэрыторыі ВКЛ. У XIX ст. вядома ў спрошчаным варыянце крою і аздаблення як верхняя доўгая вопратка сялянства. Эталонная, арыгінальная форма – доўгі, за калена, кунтуш, падшыты футрам, упрыгожаны навяснымі пятліцамі з нашытайпа краях і швах кантрасстнага колеру тасьмой. На Беларусі набыла выгляд доўгай і даволі шырокай сукенкі з цэльнакроенай спінкай і поламі з вялікім каўняром натуральнага белага, шэрага, карычневага колеру з нашытым па краях кантраснага колеру шнуром (карычневы, чорны).

**Бурнос** – мужчынскае верхняе адзенне з сукна, як бурка, але без башлыка.

*Галаўныя ўборы.*

**Аблавуха –** традыцыйная мужчынская шапка-вушанка з аўчыны або заечага, лісінага, вавёрчынага ці трусінага футра, пацягнутая зверху цёмным сукном. Да асновы яе прышывалі 4 крылы (вушы), пярэдняе і задняе паднімалі і звязвалі зверху, бакавыя апускалі ці падвязвалі пад падбародкам.

Аблавуху насілі на Беларусі да пач. 20 ст.

**Картуз** – мужчынскі летні галаўны ўбор з казырком. Шылі найчасцей з чорнага сукна. У канцы XIX – пач. XX ст. пераважалі картузы накшталт вайсковых шапак з шырокім каляровым аколышам і цвёрдым, часам лакіраваным, казырком.

На Панямонні і ў Цэнтральнай Беларусі традыцыйны картуз (шапку-саламянку) выплялі з саломы. Сярэдзіна яго мела палатняную падшэўку;

аколышак і казырок спераду аздаблялі 2 разеткамі, вышытымі чырвонымі баваўнянымі ніткамі.

**Магерка** – мужчынскі галаўны ўбор з лямцу.

- старадаўні мужчынскі галаўны ўбор. Вядомы ў 16-19 ст. па ўсёй Беларусі. Паводле спосабу вырабу бываюць лямцавыя (валеныя з воўны) і шытыя з чатырох кавалкаў тоўстага валенага сукна. Лямцавыя магеркі мелі выгляд каўпака або ўсечанага конуса, завернуты да палавіны вышыні аколыш шчыльна прылягаў да верху (паўдвайныя магеркі) або даходзіў да самага донца (двайная магерка). Рабілі магеркі вышынёй 15-20 см белага, шэрага, карычневага і чорнага колераў. Насілі круглы год. Высокага майстэрства ў вырабе магерак у 19 ст. дасягнулі шапавалы з мяст. Дрыбін (Горацкі раён).

**Капялюш** – мужчынскі галаўны ўбор; тое, што і брыль.

**Брыль -** капялюш, мужчынскі галаўны ўбор беларусаў. Рабілі брылі плеценыя (з саломы, мятліцы, лазы, чароту), якія насілі летам, і валеныя, лямцавыя, якія насілі ў любую пару года. Палі плеценага брыля прамыя (шыр. 4-10 см), верх у выглядзе ўсечанага цыліндра (выш. 8-10 см).

*Жаночы народны касцюм. Галаўныя ўборы.*

**Вянок** – упрыгожанне з кветак, зеляніны, стужак, паперы, пер'я і інш. у форме кружка, які надзявалі на галаву. Паводле спосабаў вырабу і аздаблення вянкі падзяляюцца на 4 віды.

*Віты* вянок з палявых кветак (адуванчык, валошка, рамонак), барвенку, руты насілі дзяўчаты летам. Такі вянок быў неабходным атрыбутам многіх традыцыйных абрадаў, у т.л. вяселля, купалля, куста, а таксама дажынак, на які плялі вянок з каласоў збажыны і кветак. Пашыраны на ўсёй Беларусі.

*Вянок-абручык* рабілі з лазы, галінак дрэва і абгортвалі разнаколернай ткаінай, ці паперай; аздаблялі зелянінай, штучнымі кветкамі, васковымі ягадкамі; ззаду прывязвалі разнаколерныя стужкі, тасёмкі.

Вядомы найбольш у Брэсцкім Палессі.

*Вянок на каркасе* выраблялі з лубу, бяросты, кардону, накшталт сіта без дна (вышынёй 10-16 см) і абцягвалі тканінай. Звонку абшывалі акраўкамі каляровай матэрыі, папяровымі кветкамі, фарбаваным пер'ем, шклянымі пацеркамі; ззаду да верхняга краю мацавалі пук стракатых стужак і пярэстыя палосы тканіны (даўжынёй каля 90 см). Выкарыстоўвалі як вясельны ўбор у Зах. Палессі, Падняроўі.

*Вянок-шапачку* рабілі з гнуткіх дубчыкаў, якія пераплятaлі, каб закрыць верх. Вонкавую паверхню высцілалі штучнымі кветкамі або фарбаваным у зялёны колер пер'ем.

Бытавалі ў Пінскім Палессі. Асаблівай разнастайнасцю і багаццем аздаблення вызначаліся вянкі на Палессі і ў Падняпроўі. Вянок надаваў постаці святочны, урачысты выгляд. У вясельным абрадзе быў сімвалам дзявочай чысціні; як убор маладой сустракаецца ў сучасным вяселлі.

**Скіндачка** – дзявочы галаўны ўбор. Называлі таксама апаяска, завязка, шырынка. Кроілі ў выглядзе ручніка з даматканага кужэльнага палатна рознай танальнай адбелкі, радзей з белага паркалю або чырвонай у блакітныя

папярочныя паскі бава́ўнянай даматканкі (шыр. 10-30, даўж. 70-140 см). Завязвалі на патыліцы так, каб не закрывала макаўку галавы, а свабодныя канцы звісалі на спіну ці грудзі. Шылі скіндачку з 3 частак – вузкай сярэдняй і шырокіх бакавых. Шырокія скіндачкі складвалі па даўжыні ў 2-4 столкі; у тую частку, што абвязвала галаву, устаўлялі паперу, кардон, луб або падшывалі палатно. Святочны скіндачкі аздаблялі вышыўка (крыжыкам, працягам, мярэжкай, гафтам), узорыстым натыканнем, карункамі, мохрыкамі, аплікацыяй і інш. Часцей выкарыстоўвалі геаметрычны арнамент: па канцах скіндачкі размяшчалі шырокі ўзорысты шляк, адзін або два падоўжныя бакі аздаблялі вузкімі ўзорыстымі паскамі. Каларыт арнаменту чырвона-малінавы з чорнымі ці блакітнымі ўкрапінамі, радзей белы з чырвоным. У вясельным касцюме скіндачку дапаўняў вянок з кветак.

Шырока бытавала да канца XIX ст. амаль па ўсёй Беларусі, у пешай пал. XX ст. захавалася ў калінкавіцкім строі.

**Кубак** – святочны галаўны ўбор дзяўчат у неглюбскім строі XIX – сяр. XX ст. Гранёная або часткова скругленая на патыліцы карона-каробачка выш. 11-12 см, якую надзявалі паверх валасоў. Заплеценых у адну касу.Каробачку (каркас) рабілі з лубу, паперы і абшывалі тканінай. Аздаблялі кубак паскам белых карункаў, гладка-фарбаванымі чырвонымі, зялёнымі, аранжавымі, сінімі стужкамі (кожная стужка выступала адна з-пад адной на 3-5 мм). Па ніжнім краі нашывалі самую прыгожую, затканую рознакаляровымі дробнымі кветачкамі, лісцікамі на фіялетавым фоне стужку – “цвятоўку”, якая сваёй прыгажосцю вылучалася ў агульнай кампазіцыі. Колькасць стужак даходзіла да 25. Ззаду стужкі сшывалі, свабодныя канцы іх пакідалі даўжынёй на 1 м. На усходзе Магілёўшчыны і Гомельшчыныкубак таксама вядомы як вясельны галаўны ўбор.

**Чылка –** дзявочы галаўны ўбор у святочным ці вясельным касцюме ў Зах. Палессі (Брэсцкі, Маларыцкі р-ны) канца 19 – пач. 20 ст. Выраблялі з лубу, кардону, накрухмаленага палатна ў выглядзе кароны-абручыка выш. 8–10 см з дэкаратыўным зубчыкам над ілбом. Аздаблялі рознакаляровымі стужкамі і тасёмкамі, выкладзенымі паралельна лініі нізу, нашыўкамі бісеру, паскаў тканіны. Адзявалі паверх валасоў, расчасаных на прабор і заплеценых у касу.

Вясельныя чылкі ўпрыгожвалі кветкамі. Пры благаславенні на шлюб маці маладой закладвала за чылку хлеб, соль, цукар, каб маладая сям’я жыла шчаслівa і ў дастатку.

**Намітка –** даўні галаўны убор замужніх жанчын на Беларусі. Лакальныя назвы навойнік, сярпанка, плат, завівала. Складаўся з уласна наміткі – тонкага белага кужэльнага палатна (ручніка) шыр. 30-60 см, даўж. Ад 2,3 – 2,6 да 5 м, абкручанага паверх чапца, і тканкі (валік з кудзелі, абшыты палатном, на які накручвалі валасы). Вядома каля 30 спосабаў навівання. Часам абодва канцы завязваліся ззаду (магілёўскі строй, над ілбом ці па баках (капыльска-клецкі строй); найчасцей адзін канец праходзіў пад барадой і драпіраваўся над плячом, а другі спадаў на спіну. Часам намітку замацоўвалі доўгімі шпількамі, тады яе можна было здымаць, як шапку.

Канцы наміткі, іншы раз і край над ілбом аздаблялі арнаментам (вышыўка ці натыканне), карункамі, мохрыкамі (пухавіцкі, маларыцкі, кобрынскі строі).

Святочную намітку аздаблялі зелянінай, букетамі штучных ці жывых кветак, папяровым веерам (ляхавіцкі строй), пер'ем (кобрынскі строй), маляўнічай каробачкай з двума "рожкамі" – пукамі фарбаванага пер'я (касцюм свацці ў маларыцкім строі)

Першы раз у намітку ўбіралі на вяселлі (абрад завівання), пасля чаго жанчына не выходзіла на людзі без яе. На Палессі бытавала да 1930 гг.

**Хустка** – жаночы галаўны ўбор, квадратны кавалак тканіны або ажурнага палатна, прызначаны для пакрыцця галавы і плячэй. Насілі асобна або разам з тканкай, чапцом, каптуром. Складзеную трохвугольнікам, завязвалі спераду (пад падбародкам) ці ззаду, а таксама насілі ў выглядзе буслянкі. (хустка абвівала галаву і завязвалася спераду або падтыкалася па баках).

Хустка шырока выкарыстоўвалі ў вясельнай, пахавальнай, радзіннай абраднасці. На Палессі, Панямонні, у Цэнтральнай Беларусі ў канцы 19 – пач. 20 ст. хустка замяніла намітку. У турава-мазырскім і давыд-гарадоцка-тураўскім строях звычайна насілі 2-3 хусткі адначасова, прычым адна з іх драпіравалася пад падбародкам.

Рабілі хустку з ільняной, ваўнянай, баваўнянай даматканкі або вязалі на прутках (памеры звычайна 180, 100, 70 см). Суцэльнатканыя і сшыўныя (з 2-3 частак) хусткі аздаблялі ўзорыстым натыканнем, вышыўкай, набойкай, карункамі, махрамі. Выбар матэрыялу, характар і прыёмы аздаблення залежалі ад сезоннага прызначэння хусткі, спосабу завязвання, агульнага ансамбля і традыцый касцюма пэўнага рэгіёна.

Зімовыя хусткі (апінанка, ахілянка, круцьвенька, канаплянка) вызначаліся вялікімі памерамі, іх ткалі або вязалі з белай, карычневай, чорнай воўны. Тканіну ці ажурнае палатно часта прывальвалі і аздаблялі па ўсіх чатырох баках ці адным рагу махрамі, кутасамі, карункамі, на краях натыкалі шлякі. Насілі паверх звычайных хустак або накідвалі на плечы.

Па ўсёй Беларусі пашыраны белыя, натуральнага колеру лёну ці воўны летнія хусткі.

Высокага майстэрства ў стварэнніхустак для летняга святочнага ўбору дасягнулі народныя майстры Падняпроўя і Усх. Палесся (стылявыя адметнасці іх суадносяцца з межамі народных строяў).

Хустку турава-мазырскага строю шылі з белага паркалю, аздаблялі вышыўкай гладдзю ці крыжыкам. Сакавіты разнаколерны арнамент з лісця, сцяблінак дрэў, кветак вызначаўся адметнай графікай малюнка, які кампанаваўся пышным букетам па цэнтры хусткі і адным рагу або толькі ў адным рагу.

Хусткі магілёўскага строю аздаблялі чырвоным або чырвона-чорным геаметрычным арнаментам вышыўкі ўсіх чатырох рагоў.

Хусткі пінска-івацэвіцкага строю вылучаліся тонкасцю палатна, вытанчаным узорам букетаў, вянкоў, вазонаў на адным з рагоў.

Для строяў Падзвіння характэрна аздабленне блакітным набіваным арнаментам, на Панямонні вязалі ажурныя чорныя, карычневыя, шэрыя, белыя хусткі.

У канцы 19-20 ст. вялікае пашырэнне атрымалі шаўковыя, кашаміравыя, паркалёвыя хусткі фабрычнай вытворчасці (маліноўкі, кашміроўкі, канаплянкі, дубальтоўкі і інш.).

**Каптур** – традыцыйны галаўны ўбор замужніх жанчын; паўшарападобная ці плоская прызбораная на патыліцы шапачка з вушкамі, да якіх прышывалі стужкі для завязвання пад барадой.

Бытаваў пераважна ў Цэнтральнай і Заходняй Беларусі да пач. 20 ст. (у XVI-XVII ст. яго насілі знатныя гаражанкі і шляхцянкі).

Шылі каптур з аксаміту, шоўку, атласу, паркалю звычайна чырвонай гамы: вушкі і перад аздаблялі вышыўкай, залатой і сярэбранай тасьмой, нашыўкамі рознакаляровых стужак, бісерам.

Надзявалі на тканку (круглы валік, на які накручвалі валасы), зверху часта завівалі намітку, завязвалі хустку.

**Падвічка** – галаўны ўбор замужніх жанчын накшталт кароны ў ляхавіцкім строі.

Прадаўгаватым кавалкам (шырыня 12-15 см, даўжыня 50-60 см) саціну, атласу, парчы – уласна падвічка – абгортвалі тканку з чапцом і замацоўвалі шпількамі і іголкамі. Для пруткасці ў падвічку ўстаўлялі кардон, паперу, накрухмаленае палатно. Выкарыстоўвалі пераважна тканіну чырвонага колеру з вертыкальнымі белымі палоскамі ці блакітнага колеру з раслінным узорам. Святочныя падвічкі ўпрыгожвалі букетамі жывых кветак ці дэкаратыўнай зеляніны, які ўтыкалі збоку ці па цэнтры падвічкі, а таксама тасёмкамі, пацеркамі і інш. У вясельным уборы паверх падвічкі завівалі намітку, а на патыліцы мацавалі пышны букет кветак.

**Чапец** –

1. састаўная частка даўняга галаўнога ўбору замужніх жанчын Беларусі – круглая шапачка з фабрычнай тканіны або вязаная з ільняных ці баваўняных нітак. Называлі таксама чэпік. Чапец накладалі на абручык-тканку ці жмут кудзелі і сцягвалі ззаду матузком, налобную частку аздаблялі вышыўкай. Чапец заможных гараджанак 16-17 ст. шылі з парчы, шоўку і інш. каштоўных тканін (налобны пасак багата аздаблялі жэмчугам, металічнымі медальёнамі). Зверху завязвалі намітку ці хустку. У наш час чапцы носяць некаторыя пажылыя жанчыны на Палессі.

2. Галаўны ўбор дзіцяці, які адзявалі з 2 месяцаў да 2-3 гадоў. Меў форму круглай шапачкі з вушкамі, аздабляўся вышыўкай, нашыўкамі фальбаваных стужак, тасёмак, карункамі вакол ілба.

3. У многіх мясцовасцях Беларусі тое, што каптур.

*Плечавое адзенне.*

**Кашуля**, сарочка, асноўная частка мужчынскага і жаночага беларускага народнага адзення. Яе насілі ў любым узросце, у будні і святы, пры любым сямейным і сацыяльным становішчы. Важны паказчык этнічнай спецыфікі матэрыяльнай культуры беларусаў. Шылі з ільнянога даматканага палатна. Мужчыны насілі кашулю паверх нагавіц і падпярэзвалі поясам, жанчыны заправулялі ў андарак (ці панёву), запіналі фартухом. Паводле крою вылучаюць 3 тыпы кашулі: тунікападобныя (найбольш старажытныя) – у згорнутым удвая палотнішчы на перагібе рабілася адтуліна для галавы; з прамымі плечавымі ўстаўкамі (самы пашыраны) – пярэдняя і задняя палавіны стана злучаны прамавугольнымі палікамі; з гесткай (пашырыліся з канца 19 ст. пад уплывам гарадскога касцюма) – палавіны злучаліся з дапамогай гесткі. Традыцыйная кашуля мела прамы рукаў з манжэтай (каўнерцам), адкладны каўнер, прамы разрэз на грудзях, пад пахам устаўныя цвіклі.

Бытавалі і кашулі з невысокім стаячым каўняром або без яго, а таксама жаночыя кашулі з каўняром у выглядзе брыжоў (калінкавіцкі строй).

Святочныя, асабліва жаночыя, кашулі аздаблялі (рукавы, каўнер, манішка) натыканнем, вышыўкай, часцей чырвонага і чорнага колеру. Арнамент пераважна геаметрычны.

**Гарсет, кабат, шнуроўка, станік, кітлік, камізэлька, каптанік –** частка жаночага касцюма без рукаваў з розных матэрыялаў на падкладцы.

*Паясное жаночае адзенне*

**Спадніца** – састаўная частка жаночага касцюма беларусаў; паясная адзежына ў выглядзе некалькіх сшытых полак тканіны, сабраных на пояс. Узнікла ў свецкім касцюме 14 ст., відаць, адначасова з фарміраваннем тагачаснага еўрапейскага крою з ліфам, вытачкамі, акруглай формай рукавоў і г.д. У бел. Касцюме заможных класаў вядома з 16 ст., а ў народным касцюме пашырылася даволі позна (яшчэ ў 19 ст. жыхары асобных раёнаў Палесся не ведалі слова спадніца і характэрных для яе відаў крою).

**Андарак** – спадніца з шарсцяной ці паўшарсцяной саматканкі ў клетку або ў падоўжныя ці папярочныя палосыэ Лакальная назва *даматкан, сукня*. Шылі з 3-5 полак, вытканых у 2-3 ніты. Часта дадатковымі элементамі дэкору служылі запрасаваныя складкі, вышыўка, нашыўкі карункавых тасёмак, стужак.

З пач. XX ст. былі пашыраны аднатонныя чырвоныя, сінія і інш. Святочныя андаракі абавязкова гафрыравалі (складзены ў складкі андарак клалі на ўслон, накрывалі чыстым ручніком і прыкладвалі гарачым хлебам)..

Вядомы на ўсёй Беларусі, за выключэннем паўднёва-заходніх рэгіёнаў; ва ўсходніх і паўднёва-ўсходніх раёнах андаракі былі з прышыўным ліфам. Выйшаў з ужытку ў 1920-я гг., у Зах. Палессі – у 1930-я гг.

Паступова была страчана адпаведная сувязь паміж назвай, матэрыялам і кроем, і ў асобных мясцовасцях Беларусі ў XX ст. андаракам сталі называць жаночую спадніцу з іншай сыравіны.

**Бурка –** 1. мужчынская вопратка з самаробнага сукна карычневага, чорнага, шэрага колеру з адкладным каўняром і прышпіленым башлыком,

прамога крою, даўжынёй да калена.Надзявалі ў дарогу ў халоднае ці дажджлівае надвор'е. Сярод сялянства распаўсюджана ў XIX ст. і вядома ў XXст.

Мужчынская вопратка з башлыком, што надзявалі ў дарогу ў халоднае ці дажджлівае надвор'е паверх кажуха ці світкі. Доўгая, прамога крою, двухбортная, з адкладным каўняром, шырокім хлясцікам (радзей падпяразвалася поясам), 4 праразнымі кішэнямі (вертыкальнымі на грудзях, гарызантальнымі па баках); зашпільвалася на гузікі. Шылі з саматканага валенага сукна карычневага, чорнага ці шэрага колераў. Святочныя буркі ўпрыгожвалі аблямоўкай, шнурком, дэкаратыўнай строчкай (штапам) і нашыўкамі з чорнага ці чырвонага сукна, тасьмы; найбольш выразна аздаблялі башлык. Узоры галінак, арнамент з ліній, зігзагаў, сетак, утвораныя штапам, стасаваліся з агульнымі канструкцыйнымі элементамі буркі. Як тып вопраткі прыйшла ў Еўропу з Усходу (тэрмін лічыцца персідскім).

На Беларусі вядома з 17 ст., напачатку як адзенне для верхавой язды. З канца 19 ст. пад уплывам гарадскога касцюма замацавалася ў сялянскім асяроддзі. Да 1950-х гг. Бытавала амаль на ўсёй Беларусі (у некаторых мясцовасцях называлася бурносам).

2. жаночая спадніца з воўны натуральнага колеру ў гарызантальныя шлякі (Брэстчына).

Шчыльная ўзорыстая спадніца з паўшарсцяной валенай саматканкі; святочнае паяснае адзенне жанчын Магілёўшчыны, характэрна таксама для маларыцкага строю. Шылі з 4-5 полак, якія ткалі камбінаваным спосабам: узор выконвалі бранай, фон – шматнітовай тэхнікай. Бурка была адносна кароткай (закрывала калені) з запрасаванымі буйнымі складкамі. Аздаблялі вытанчаным геаметрычным арнаментамкарычнева-чырвоных папярочных палос, што рытмічна чаргаваліся і заканчваліся больш шырокім дамінуючым шлякам па нізе. Буркі насілі да 1940-х гг.

**Бурнос** – 1. верхняе адзенне беларускіх жанчын. Пашыраны з 19 ст. пад уплывам зах.-еўрап. гарадскога касцюма. Апраналі яго ў халоднае надвор'е як святочную вопратку замест світкі ці кажуха. Шылі з шэрага, радзей белага, саматканага валенага сукна. Аднабортны, доўгі, расшыраны ўнізе бурнос зашпільваўся на гузікі, меў адкладны каўнер (на Вілейшчыне без каўняра) і 2 невялікія бакавыя завышаныя накладныя кішэні ў форме пяцівугольніка. Рукавы з авальна падкроенай галоўкай уточваліся ў круглую пройму. Аздаблялі нашыўкамі і аблямоўкай чорнага аксаміту (мошасту), шаўковай ці сацінавай тасьмы, дэкаратыўным чорным штапам (машыннай строчкай). Чорныя паскі нашывак рознай шырыні арганічна спалучаліся са строгай графічнасцю лінейнага арнаменту ў выглядзе хваль, зубчыкаў, спіралей, утвораных чорнымі ніткамі машынных строчак, што кампанаваліся ўздоўж беражкоў, па крыссі, па нізе спінкі, рукавоў, на кішэнях і каўняры. Найбольш пашыраны ў строях Панямоння і Цэнтральнай Беларусі да 1930 – гг.

2. мужчынскае верхняе адзенне з сукна, як бурка, але без башлыка.

**Аборкі, абора** – вяровачка з пянькі, лёну ці раменны пасак для прымацоўвання лапця і анучы.

На Палессі вяровачныя аборы часта фарбавалі ў чорны колер (іншы раз звівалі з чорнай шэрсці); "Цяцёрка ў чорных аборках" – казалі пра сялянскую франціху. На Маларытчыне вядомы аборы з конскага воласа. Аборы працягваліся (забарсвалася) праз вушкі лапця (забарсні), абкручаная анучай ступня зацягвалася аборай у пад'ёме і закручвалася накрыж да сярэдзіны галёнкі (на Пн Беларусі мужчыны карысталіся кароткімі аборамі, якія закручвалі толькі да шчыкалаткі). На Тураўшчыне жанчыны намотвалі аборы шчыльна, без прамежкаў.

**Абутак.** Кавярзні, шчарбакі, зрачыя, пахлапні, пасталы, боты, чаравікі.

**Лапці** – традыцыйны сялянскі плецены абутак. Рабілі прамога і касога пляцення.

**Гарлячка** – жаночае шыйнае ўпрыгожванне з бісеру (рэгіянальнае в. Неглюбка, Гомельская вобл.).

**Дзеравяшкі** – сялянскі абутак на падэшве з кавалка дрэва. Верх – з розных матэрыялаў або скуры.

**Аксаміт** – шаўковая тканіна. Гісторыю ўзнікнення звязваюць з вытворчасцю ў Кітаі і Індыі.

**Галёны** – пазумент, стужкі, карункі для ўпрыгожвання жаночага адзення (у "кракаўскім" убранні. Пінскі раён, Брэсцкая вобл.).

*Літаратура:*


1. Бялявіна, В. М. Беларускі касцюм / В. М. Бялявіна, Л. В. Ракава. – Мінск : Беларусь, 2017. – 463 с. : іл.
2. Віннікава, М. М. Традыцыйны беларускі касцюм : альбом / М. М. Віннікава, П. А. Богдан. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – 302 с. : іл.
3. Лобачевская, О. А. Белорусский народный костюм : крой, вышивка и декоративные швы / О. А. Лобачевская, З. И. Зимина. – Минск : Беларуская навука, 2009. – 280 с. : ил.
4. Маленка, Л. І. Беларускі народны касцюм / Л. І. Маленка. – Мінск : Ураджай, 2001. – 160 с.
5. Этнаграфія Беларусі: энцыкл. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.


### *2.7.2 Традыцыйнае ткацтва.*

*Ткацтва. Інструменты і абсталяванне. Тыпы ткацкіх станкоў. Матэрыялы і сыравіна. Прадзенне і фарбаванне. Падрыхтоўка кроснаў да ткацтва. Снаванне. Навіўка асновы. Віды і тэхнікі ткацтва. Двухнітовае і шматнітовае ткацтва. Закладное, бранае, выбарнае, ажурнае, пераборнае, падвоенае ткацтва. Утылітарна-дэкаратыўныя тканіны і тканіны для адзення. Посцілкі. Ручнікі. Ходнікі. Абрусы.*

*Карункі. Вязаныя і плеценыя карункі. Тэхналогія вырабу. Матэрыялы і прылады.*

Народнае ткацтва з'яўляецца яркай нацыянальна-маркіруючай прыкметай і выступае ў грамадскай свядомасці як фактар нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, вывучэнне ткацтва служыць дзейным сродкам, які садзейнічае фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці. Увогуле дэкаратыўнае мастацтва і ткацтва ў прыватнасці выконвае складаныя эстэтычныя, этычныя і выхаваўчыя функцыі, яно здольна знаходзіць водгук у чалавечай душы і фарміраваць гэтую душу не толькі прамым тэкстам, але і глыбокім паэтычным падтэкстам, які ўключае тонкі ланцужок асацыяцый паміж адлюстраваннем і ўяўленнем пра яго, што захоўваюцца ў народнай памяці і ў асабістым псіхалагічным вопыце кожнага чалавека.

Ткацтва – выраб тканін на ткацкім стане або спецыяльным прыстасаванні з перапляценнем ніцей асновы і ўтку. Народнае ткацтва Беларусі ўключае выраб тканін на гарызантальным ткацкім стане, а таксама ткацтва паясоў.

Пачаткам вырабу тканін пры дапамозе спецыяльных прыстасаванняў на Бліжнім Усходзе (Сірыя, Месапатамія, Егіпет) лічаць 5-е тысячагоддзе да н.э., а на тэрыторыі Беларусі – з часоў позняга неаліту (2500 – 1800 гадоў да н.э.) і ранняга бронзавага веку ( каля 2000 гадоў да н.э.). У літаратуры прыводзяцца і некалькі іншыя часавыя рамкі з'яўлення ткацтва на Беларусі: 3-тысячагоддзе да н.э. [188; 239]. Пра ткацтва эпохі жалезнага веку (ад 7-6 ст да н.э. да 8 ст. н.э.) даюць уяўленне невялікія кавалачкі тканін, выробленыя з шэрсці і льну, якія захаваліся на жалезных, бронзавых і медных рэчах, а таксама адбіткі тканін на гліняным посудзе. Ткацтва перыяду Кіеўскай Русі на тэрыторыі Цэнтральнай Беларусі знойдзена ў Мінску, у курганах каля Заслаўя (Мінскі раён). У гэты перыяд часцей за ўсё сустракаюцца льняныя і пяньковыя тканіны ў 2 ніты, вытканыя "елачкай" у 4 ніты, а таксама выяўлены камбінаваныя тканіны з шарсцяных і льняных нітак, шарсцяных нітак з дабаўленнем восцевых валасоў".

На Беларусі ткацтва вядома з глыбокай старажытнасці, пра што сведчаць археалагічныя знаходкі (прасліцы, адбіткі тканін на керамічных пасудзінах, многія з якіх датуюцца 2-й пал. І-га тысячагоддзя). У 11-13 стст. для вырабу тканін выкарыстоўвалі 4-нітовае прыстасаванне, якое, магчыма, было яшчэ без станін і нагадвала прыстасаванне для ткацтва паясоў (бердзечка).

Найбольш багаты этнаграфічны матэрыял пра беларускае народнае ткацтва адносіцца да канца 19-пач. 20 ст.

Сыравінай для ткацтва на Беларусі здаўна служылі лён, воўна, радзей пянька. Усе працэсы, звязаныя з апрацоўкай сыравіны і падрыхтоўкай яе да ткання, выконваліся ўручную – звычайна гэта была жаночая работа. У

кастрычніку лён мялі, трапалі, часалі, у лістападзе пачыналі прасці. Пралі пры дапамозе верацяна альбо калаўрота на працягу ўсяго тыдня за выключэннем святочных дзён і нядзелі. Затым пражу рыхтавалі для ткання: бялілі альбо фарбавалі, снавалі. У сакавіку, калі дзень павялічваўся, у хату прыносілі ставы і ўвесь панарад (ніты, бёрда, набіліцы, панажы і інш.). У наладцы красён і ткацтве звычайна ўдзельнічалі 2-3 жанчыны. Тонкае кужэльнае палатно ткалі для намітак і кашуль; матэрыял для рукавоў натыкалі паскамі бранага ўзора.

**Лён** – аднагадовая расліна з моцнымі прамымі доўгімі сцябламі. Лён патрабуе добра ўгноенай і вільготнай глебы. Працэс атрымання валакна з'яўляецца дастаткова працаёмкім. Пасля сазравання льну яго рвалі. Вязалі, абівалі пранікамі, сцялілі ці мачылі для адслаення драўніны, сушылі, мялі для аддзялення кастры, трапалі для ачысткі ад дробных частак кастры, часалі і толькі потым пралі і ткалі.

Большую частку льнянога валакна перапрацоўвалі ў звычайнае палатно.

Льнянога палатна ў сялянскай гаспадарцы патрабавалася надзвычай многа, таму ткалі яго ў вялікай колькаскі, дзесяткамі метраў. Дэкаратыўных тканін, якія мелі вялікае значэнне ў аздабленні інтэр'ера жылля, выраблялі значна менш, з той прычыны, што яны патрабавалі значна большага часу і працы. Такім чынам, тканіны можна падзяліць у залежнасці ад складанасі выканання на два віды: палатно і дэкаратыўныя тканіны.

**Канапля** – аднагадовая расліна, для якой патрабуецца цёплы і вільготны клімат. Дасягае вышыні да 2,5 м. Сеялі канаплю позна, у пачатку чэрвеня. "У адрозненне ад ільну канаплю рвалі ў два этапы. Спачатку рвалі мужчынскія сцяблы ("пласканне", "плоскунь"), якія не давалі насення; жаночыя сцяблы ("мацеркі", "майткі") рвалі пасля вызравання насення. Валокны мужчынскіх сцяблоў былі мяккія", таму ішлі яны на выраб тканін. Канапля як сыравіна для ткацтва выкарыстоўвалася даволі рэдка, але "вырошчвалі яе даволі шмат, асабліва ў Магілёўскай і паўднёва-ўсходніх раёнах Мінскай губерніі, адкуль яна вывозілася і за мяжу".

Канапляныя валокны (пянька) вызначаецца ўстойлівасцю да згібання, трэння, таму ў сялянскім побыце яе часцей выкарыстоўвалі для розных гаспадарчых патрэб: вырабу вяровак, абор (завязак для лапцяў, якія трымаюць лапаць і абвіваюць анучы). У рэдкіх выпадках пражу з пянькі выкарыстоўвалі для ўтка ў час вырабу абрусаў і ручнікоў, таму што валокны ў канопляў значна грубейшыя за льняныя. Каб адзначыць трываласць канапляных валокнаў можна дадаць, што ў сучаснай прамысловасці канаплянае валакно выкарыстоўваецца ў якасці асяродка ў стальных тросах.

У другой палове XIX стагоддзя ў тканінах хатняга вырабу ў невялікай колькасці для ўзорнага ўтка пачынаюць уводзіць рознакаляровыя, пераважна чырвоныя, **баваўняныя ніткі** фабрычнай вытворчасці. У XX ст. паўсюды льняная пража стала замяняцца баваўнянай. Часам аснову у ручніках рабілі з

ільняных нітак, а ўток – з баваўняных нітак. Да сярэдзіны ХХ стагоддзя яны значна пацяснілі лён, які ў народным ткацтве 1960 – 2000-х гадоў ужо практычна не выкарыстоўваўся.

Традыцыі ткацтва на Беларусі даўнія і глыбокія, звязаныя з неабходнасцю стварэння адзення і тэкстыльных вырабаў для побыту. Лакальныя традыцыі ткацтва надзвычай разнастайныя. На Беларусі вядомы разнастайныя тэхнікі і спосабы ткацтва на кроснах: нітовае, закладное, выбарнае, пераборнае, ажурнае, бранае. Паясы ткалі на дошчачках, на ніту і на бердзечку, на кроснах.

Натуральна, што традыцыі ткацтва сыходзяць у нябыт у сувязі са знікненнем утылітарнай запатрабаванасці ў тканінах. Але ёсць цікавасць да тканых прадметаў як твора мастацтва, як этнаграфічнага аб'екта, як атрыбута этнічнай самаіндэфікацыі.

Чатырохнітовае ткацтва – адна з найбольш старажытных і распаўсюджаных тэхнік народнага ткацтва. Пашырана па ўсёй Беларусі. У чатырохнітовым ткацтве выдзяляюць аднаўточнае і двухуточнае ткацтва. Аднаўточнае ткацтва дазваляе атрымаць тканіну палатнянага, рыпсавага, саржавага , паўажурнага і ячэістага перапляцення.

Палатнянае перапляценне – самы просты від ткацтва, якім з лёгкасцю авалодваюць усе студэнты. Пры змене колеру ўточнай ніткі атрымліваецца паласатая тканіна палатнянага перапляцення. Пры выкарыстанні нітак, не адпаведных па таўшчыні аснове, атрымліваецца рыпсавае преапляценне.

Нітовы спосаб вырабу чатырохнітовых тканін пачаў укараняцца на прадпрыемствах мастацкіх промыслаў з 1980-х гг.

**Тканыя вырабы.**

У залежнасці ад свайго галоўнага прызначэння беларускі традыцыйны ручнік можна ўмоўна далучыць да дзвюх адасобленых груп тканін: дэкаратыўна-абрадавых і гігіенічна-бытавых. Сярод апошніх вылучаўся **ўціральнік** ("уціраннік"). Паводле даследаванняў М.Я. Нікіфароўскага, на Віцебшчыне яго асноўная служба заключалася ў выціранні рук і твару пасля ўмывання. Прычым на патрэбу сям'і выдзяляўся толькі адзін ручнік, які звычайна вісеў пасярэдзіне сцяны, супроць "полу ў пылаць". У лазню яго не бралі: цела тут выціралі бялізнай – знятай ці падрыхтаванай да змены. Такое ж выкарыстанне ўціральніка было характэрна і для іншых рэгіёнаў. Выглядаў ён усюды аднатыпна: не надта доўгі (каля 1,5 метра), вытканы палатняным, а часцей саржавым перапляценнем. Канцы іншы раз упрыгожваліся сціплымі палоскамі натыкання, а часцей аздабляліся карункамі, плеценымі з нітак асновы.

"Да ліку ручнікоў утылітарнага прызначэння адносіўся **скарач** – маленькі, квадратнай ці падоўжанай формы, неад'емнай прыналежнасцю якогабылі доўгія махры("пачопкі"), часам акуратна спавітыя прыгожымі шнурамі-кутасамі. На Палессі такі ручнік называўся "**трапкач**", "пацірач", на паўночным захадзе – "брэндзал". Не паравітыя, растрапаныя канцы скарача далі яму яшчэ адно найменне "патрэпнічак". Звычайна больш складаныя за

ўціральнік па каларыту, спосабах выканання, скарачы ніколі не ткаліся асобным вырабам, а адразаліся ад простага ці ўзорыстага палатна. Яны ўжываліся для выцірання посуду, рук, а пругка сплеценымі кутасамі іх, па сведчанні старажылаў, "на скорую руку білі дзяцей". Галоўная ж функцыя такога ручніка заключалася ў выкарыстанні яго ў якасці зручнай, лёгкай і таннай прылады для пераносу керамічнага посуду з ежай. Сабраныя наверсе вакол пасудзіны доўгія махры ўтваралі трывалую ручку, што дазваляла зручна пераносіць палявыя гаршкі з хаты на сенажаць ці жніво. Адсюль пажаданая шчыльнасць тканіны, якая павінна вытрымаць вагу, і прыглушаная дэкаратыўнасць – па неабходнасці скарач сог паслужыць і сурвэтай.

Відазмененай формай ручніка быў і **надзежнік** – палатняная накрыўка для дзяжы. Яго таксама выкарыстоўвалі на ўрачыстым паднашэнні хлеба-солі, караваю. Увогуле ж гэта адзін са шматлікіх прыкладаў найцяснейшай сувязі ручніка з хлебам, якая праглядваецца скрозь усю сямейную і каляндарную звычаёвасць беларусаў.

У канцы XIX – пачатку XX стагоддзя на Беларусі бытавалі і невялікія палатніны накшталт рускіх шырынак. У Калінкавіцкім раёне, дзе імі шырока карысталіся для падарункаў, яны мелі назву "**платкі**". На тэрыторыі Заходняга Палесся ткалі незвычайнай формы **ручнікі "для свата"**, характэрнай рысай якіх была наяўнасць больш вузкага па шырыні і амаль квадратнага па памерах кавалачка палатніны, прымацаванага па абодва канцы вырабу. Падняпроўе вылучалася самабытнымі **радзіннымі** ручнікамі, цалкам затканымі і не надта доўгімі. Існавалі яшчэ і **абыдзённікі** – спецыяльна тканыя для выканання пэўнага абраду.

У гэтай сувязі дарэчы будзе ўспомніць і традыцыйны жаночы галаўны ўбор ручніковага тыпу, які меў выгляд падоўжанага кавалка хатняй палатніны з узорыста вышыванымі ці тканымі канцамі. Характар узору, яго спецыфіка трапна адлюстраваны амаль паўсюдна вядомай на Беларусі назвай – "**намітка**". Сапраўды, жанчыны яе намотвалі, завівалі, абкручвалі мудрагеліста вакол галавы, пакідаючы свабодным твар. У беларусаў намітка лічыцца адным з самых архаічных прадметаў жаночага строю, на што, бясспрэчна, указвае і комплекс абрадавага ўжывання, і развітая сістэма знакавых функцый, уласцівых данай рэчы. Па сваёй форме і манеры аздаблення яна вельмі падобная на дзявочую **скіндачку ("хусту")**, хаця апошняя была прыкладна напалову, а то і ў тры разы карацей. Розныя памеры ўказваюць на кардынальныя адрозненні ў спосабах павязвання жаночага і дзявочага ручніковых галаўных убораў. Завязаная вакол галавы скіндачка пакідала свабоднымі вярхушку галавы, валасы каля лба, дазваляла насіці ь косы (касу) ці распушчаныя валасы. Між іншым, згаданыя палатніны нельга аднесці да ўбрання, якім карысталіся выключна беларусы. Ужыванне галаўных жаночых убораў накшталт наміткі, ручніка, галаўной павязкі зафіксаваны этнографамі амаль ва ўсіх славянскіх народаў. Ва ўкраінскім жаночым касцюме , напрыклад, завязаную адмысловым спосабам намітку ведалі як "плат", "перамітку", "рантух", "ручнік". Адзіныя генетычныя карані

ручніка і наміткі пацвярджаюцца і асаблівасцю абрадавага выкарыстання абодвух прадметаў. Вядома ж, намітка ў першую чаргу выконвала ролю галаўнога ўбору, аднак у некаторых мясцовасцях замест ручніка ў традыцыйнай сямейнай і каляндарнай звычаёвасці. У Старадарожскім раёне, напрыклад, яна выконвала ўсе абрадавыя функцыі, уласцівыя ручніку.

Нарэшце, варта прыгадаць ручніковую тканіну, прызначаную для ўпрыгожвання абразоў ці **бажніцу**. Гэта набожнік (дарэчы, назва амаль адзіная па ўсёй тэрыторыі Беларусі, хаця зафіксаваны дзе-нідзе “завеска”, “плат”, “абразны ручнік”). Адметныя рысы яго – выразная дэкаратыўнасць і пэўная даўжыня, якая вар’іравалася ад 2 да 5 метраў у залежнасці ад памераў бажніцы і колькасці абразоў. Пакрывалі бажніцу звычайна адным суцэльным вырабам, іншы раз вылучаючы галоўны абраз асобным, найлепш аздобленым набожнікам. Выкарыстоўвалі такі ручнік, асабліва ў першай палове XX стагоддзя, і ў якасці спецыяльна пашытаў дэкаратыўнай занавескі для кута.

Найпрыгажэйшыя сярод іншых відаў ручнікоў, **набожнікі** адрозніваліся паміж сабой характарам свайго дэкору. Больш сціплыя прызначаліся для штодзённага побыту і надавалі будзённы выгляд інтэр’еру хаты. Нярэдка пэўная вобразнасць тканіны з’яўлялася адначасова і выразным напамінкам аб асобных перыядах каляндарных будняў. Так, чорнае ўзорачча “пасцянога” ручніка адпавядала тыдням Вялікіга пасту, калі панавала эмацыянальна-псіхалагічная прыглушанасць, пачуцці былі накіраваны на ўнутранае, духоўнае ачышчэнне. Зусім іншы выгляд – абавязкова з прысутнасцю і нават з перавагай чырвонага колеру – мелі святочныя набожнікі. Яны з’яўляліся знакам і народных, і царкоўных святаў, кожнае з якіх пачыналася з перайначвання звыклага інтэр’ера хаты ў святочны. У ліку традыцыйных прыгатаванняў, навядзення чысціні было і прыбіранне бажніцы: ставілі святочныя абразы, заальвалі лампадкі, свечкі, развешвалі ручнікі. Набожнік сапраўды выступаў прыкметай свята і адным з галоўных яго атрыбутаў, устойлівым па форме і нязменным па сваім асноўным месцазнаходжанні – на покуце, разам з абразамі.

**Посцілка** – найбольш пашыраны і універсальны выраб утылітарнага, дэкаратыўнага, а ў мінулым і абрадавага прызначэння. Традыцыйныя посцілкі паводле формы прамавугольныя (1,5-2,3 м даўжыня, 0,9-1,5 м шырыня) з 2 кавалкаў тканіны з ільняных нітак (або аснова льняная, уток ваўняны). У арнаменце характэрны кампазіцыі ў палоскі і клеткі, а таксама ”ў кружкі”, “у дымкі”, утвораныя спалучэннем 2 колераў (бела-чорны, жоўта-чорны. Частыя чырвоныя. Малінавыя, жоўтыя, белыя малюнкі вазонаў, кветак на чорным фоне. Такія посцілкі вешалі на сцяну як дыван, засцілалі імі ложкі; посцілкі клалі пад ногі маладым у час блаславлення іх у вясельным абрадзе. Называлася таксама коўдра, грубатканыя – дзяружка.

**Дыван** – тэкстыльны выраб, звычайна з шматколерным узорам, прызначаны пераважна для ўпрыгожвання і ўцяплення жылля. Бываюць ворсавыя і бязворсавыя (кілімы, паласы, шпалеры, габелены). Вырабляюцца ручным спосабам, з сярэдзіны 19 ст. і машынным, з воўны, шоўку, ільну,

бавоўны, штучных валокнаў. Найбольш пашыраная кампазіцыя дывана – геаметрычны ці раслінны арнаментальны ўзор на цэнтральным полі, акаймаваны шлякам. Дыванаткацтва мае шматвяковыя нацыянальныя традыцыі ў характары ўзораў, кампазіцыі, колеры, тэхніцы. На Беларусі вядомы здаўна. Побач з дэкаратыўнымі посцілкамі ткаліся народныя дываны, якімі ўпрыгожвалі жылыя памяшканні і інтэр'еры храмаў. Беларускія народныя бязворсавыя дываны ткаліся ў тэхніцы кіліма, закладання, 2-асноўнай, тыпу габелена. У розных раёнах дываны мелі сваю традыцыйную расфарбоўку і арнамент. У кампазіцыі кілімаў пераважалі кветкі, кветкі з вазонамі, лісце і кветкі, акаймаваныя шлякам з раслінным арнаментам. Ткаліся дываны з геаметрычным арнаментам, зрэдку ў дэкоры траплялія фігуркі жывёл і чалавека. Побач з народнымі дыванамі ў майстэрнях гарадоў і мястэчак ткаліся па заказах так званыя дворскія бязворсавыя дываны, блізкія па кампазіцыі да народных вырабаў, але часта па жаданню заказчыка пераймалі заходне-еўрапейскія стылі і матывы дэкору. У 18-першай палове 19 ст. на мануфактурах у Нясвіжы, Карэлічах, Міры, Гродне выраблялі шпалеры. Пасля закрыцця гэтых мануфактур тэхніка габелена стала выкарыстоўвацца ў народным сялянскім ткацтве. У другой палове 19-пач. 20 ст. (да 1916) шырока развіваўся ткацкі промысел. Ствараліся шматлікія ткацкія школы-майстэрні пры панскіх маёнтках, дзе ўручную ткалі бязворсавыя дываны ў народным стылі, а таксама ў псеўданародным па эскізах мастакоў і прадавалі ў спецыяльных храмах Вільні, Варшавы і інш. гарадоў.

**Кілім** – бязворсавы двухбаковы дыван ручной работы з воўны. Атрымліваецца ў выніку шчыльнага перапляцення каляровага утку з асновай. На Беларусі існавалі лакальныя цэнтры, дзе народныя ткачы выраблялі кілімавыя тканіны ці падобныя да іх па тэхніцы яшчэ да 17 ст., калі кілімы сталі ткаць на мануфактурах.Гэта былі невялікія па памерах дэкаратыўныя тканіны з раслінным ці геаметрычным арнаментам, якія сяляне выраблялі на кроснах і выкарыстоўвалі ў хатнім побыце, слалі ў храмах. Называліся яны каберцы, заслоны, дываны, а з сярэдзіны 17 ст. часцей ужывалася назва кілім, дыван.

З канца 17 ст. да сярэдзіны 19 ст. на мануфактурах Беларусі ў тэхніцы кіліма ткалі партрэты князёў, тканіны з арнаментальным і геральдычным дэкорам.

**Шпалеры** – насценныя бязворсавыя дываны з сюжэтнымі і арнаментальнымі кампазіцыямі. Ткаліся з каляровых шарсцяных нітак з дабаўленнем шаўковых, ільняных, часам сярэбраных ці залатых на спецыяльных ручных станках спосабам выбарачнага ткацтва, гэта значыць паасобнымі кавалкамі, якія потым сшывалі тонкай шаўковай ніткай. Характэрная асаблівасць шпалер –рубчастая паверхня правага боку і няроўная адваротная, створаная канцамі нітак утку і швоў. Шпалеры ўзнаўлялі ўзор або карціну з кардону, падрыхтаванага мастаком. У Заходняй Еўропе шпалеры вядомы з 12 – 13 ст. На Беларусі выраб шпалер пачаўся ў канцы 17 – пачатку 18 ст. на ткацкіх мануфактурах князёў Радзівілаў у Нясвіжы, Міры, Карэлічах,

Альбе (Карэліцкі р-н), Камянцы, кн. Агінскіх у Слоніме, на каралеўскіх мануфактурах у Гродне.

**Габелен** – вытканы ўручную дыван-карціна (шпалера). Спачатку – выраб парыжскай мануфактуры, заснаванай у 1662 годзе і вядомай у гісторыі як мануфактура Габеленаў (ад прозвішч майстроў-фарбавальшчыкаў, у будынку якіх пазней размясцілася майстэрня). У 17-18 ст. мастацкія якасці габелена зрабілі іх настолькі папулярнымі, што габеленамі сталі называць высокамастацкія шпалеры іншых французскіх, а пазней і еўрапейскіх мануфактур, а ў 19 ст. – наогул шпалеры і шчыльныя абівачныя тканіны нават машыннай вытворчасці (так званыя габеленавыя тканіны). На Беларусі бязворсавыя дываны-карціны ткаліся у 17-18 ст., у пач. 19 ст іх вытворчасць спынілася.

*Літаратура:*


1. Курилович, А. Н. Белорусское народное ткачество / А. Н. Курилович. – Минск : Наука и техника, 1981. – 119 с., ил.
2. Лабачэўская, В. А. Беларускія посцілкі і дываны / В. А. Лабачэўская. – Мінск : Беларусь, 2002. – 236 с. : іл.
3. Лабачэўская, В. А. Повязь часоў – беларускі ручнік / В. А. Лабачэўская. – Мінск : Беларусь, 2002. – 236 с. : іл.
4. Лобачевская, О. А. Белорусский народный текстиль : художественные основы, взаимосвязи, новации / О. А. Лобачевская. – Минск : Беларуская навука, 2013. – 527 с. : ил.


### *2.7.3 Традыцыйная вышыўка*

*Класіфікацыя швоў і тэхніка выканання. Інструменты і матэрыялы. Аздабляльныя швы. Арнаментальныя лікавыя швы. Процяг. Насціл. Лікавая гладзь. Шоў "роспіс". Вышыўка крыжам. Ажурныя швы. Мярэжка. Дэкаратыўна-канструктыўныя швы. Прыёмы краявога афармлення. Швы для памяншэння лінейных памераў тканіны. Маршчэнне.*

Вышыўка зарадзілася ў эпоху першабытнай культуры і звязана з працэсам вырабу адзення. Найбольш старажытныя ўзоры вышыўкі вядомы па рэштках археалагічных тканін (захаваліся пераважна шаўковыя), на скураным абутку, на футаралах, кашальках (12-13 ст.) – вырабах рамеснікаў з Полацка, Мінска, Турава, Давыд-Гарадка, Пінска, Слуцка, Гродна. Вырабы расшывалі еаляровымі ваўнянымі ніткамі, зрэдку шаўковымі ніткамі з характэрным арнаментам у выглядзе пляцёнкі, спіралепадобных завіткоў, канцэнтрычных кругоў, сэрцападобных фігур.

Вышываныя рэчы. Ручнік. Абрус. Адзенне. Мужчынская кашуля. Жаночая кашуля. Хвартух. Намітка. Хуста. Чапец. Гарсэт. Кажух. Світа.

Арнамент і характар узору. Месца нашывання. Колер. Тэхніка.

Вышыўка “працягам” уяўляе сабой бардзюр з геаметрычным арнаментам, які складаецца з пэўнай колькасці радоў, выкананых швом “наперад іголку”. Арнамент ствараецца паслядоўным чаргаваннем шыўкоў на правым і левым баку неабходнай даўжыні. Асаблівасцю вышыўкі “наборам” з’яўляецца негатыўнае адлюстраванне малюнка на левым баку тканіны. Такая тэхніка вышыўкі на Беларусі мае назву “завалаканне”, “нашыванне”, “набор”, “нацяг”, “нацягі”, “нацяганне”, “працягам”, “насціланне голкаю”, “насмыканне”. Для вышыўкі працягам выкарыстоўвалі баваўняныя, пераважна чырвоныя ніткі. Край і сярэднія лініі арнаментальнай паласы часам выдзялялі чорнымі ці сінімі ніткамі. Гэтай тэхнікай аздаблялі звычайна рукавы, каўняры, каўнярцы, падолы кашуль, хвартухі, наміткі.

Вышыўка “наборам”на падолах мужчынскіх кашуль уяўляе сабой традыцыйны архаічны арнамент. Такіх кашуль захавалася няшмат. Але на іх прыкладзе можна сказаць , што ў канцы XIX ст. вышыўка “наборам” па падолу з’яўляецца найменш зменлівым элементам вышыўкі мужчынскай кашулі. На манішцы, каўняры, манжэтах вышываліся “бракараўскія” узоры, але па нізу кашуль майстрыцы вышывалі “наборам” архаічны арнамент.

*Літаратура:*


1. Лобачевская, О. А. Белорусский народный текстиль : художественные основы, взаимосвязи, новации / О. А. Лобачевская. – Минск : Беларуская навука, 2013. – 527 с. : ил.
2. Рудніцкая, Г. Р. Беларуская народная вышыўка : аздабляльныя швы / Г. Р. Рудніцкая. – Мінск : Капітал Прінт, 2023. – 92 с. : іл.
3. Рудніцкая, Г. Р. Беларуская народная вышыўка. Крыжык. У 2 ч. Ч 1. Дапаможнік / Г. Р. Рудніцкая. – Мінск : Капитал Принт, 2023. – 76 с. : іл.
4. Рудніцкая, Г. Р. Беларуская народная вышыўка. Лікавая гладзь. У 2 ч. Ч 1. Дапаможнік / Г. Р. Рудніцкая. – Мінск : Капитал Принт, 2023. – 80 с. : іл.
5. Рудніцкая, Г. Р. Беларуская народная вышыўка. Працяг. У дзвюх частках. Частка 1. Дапаможнік / Г. Р. Рудніцкая. – Мінск : Капитал Принт, 2022. – 84 с. : іл.
6. Фадзеева, В. Я. Беларуская народная вышыўка / В. Я. Фадзеева . – Минск : Навука і тэхніка, 1991. - 199 с., іл.


### *2.7.4 Беларускія народныя паясы*

*Рытмічная арганізацыя кампазіцыі. Асаблівасці каларыту. Традыцыйныя беларускія паясы ў музейных зборах.*

*Спосабы вырабу. Інструменты і прылады. Плеценыя, вітыя, тканыя паясы. Пляценне на пальцах. Аб’ёмнае пляценне ў чатыры пучкі. Плоскае пляценне. Пляценне на калодачцы. Ткацтва на дошчачках. Заправачны*

*малюнак. Ткацтва на ніце і бердзечку. Віды сноўкі. Заправачная схема. Тэхніка ткання.*

Пояс як частка традыцыйнага касцюма. У якасці кампанента традыцыйнага касцюма пояс выконваў тры асноўныя функцыі:

- Утылітарную
- Дэкаратыўную
- Знакава-сімвалічную

Найбольш ярка практычнае прызначэнне пояса мела ў мужчынскім касцюме. Поясам абавязкова падпяразвалася кашуля, якая насілася навупуск. Існавала павер'е, што падпяразаны чалавек мае абарону ад злых духаў.

Пояс мужчыны насілі і з верхнім адзеннем, які дапамагаў захаваць цяпло. Пояс у мужчынскім касцюме выкарыстоўваўся і для таго, каб мацаваць на ім розныя рэчы: шабету з махоркай, крэсіва, ключы. Калі ішлі на працу, за пояс затыкалі сякеру, рукавіцы.

У жаночым касцюме пояс прышываўся да паяснога адзення, такім чынам замацоўваў край спадніцы ці андарака. Свабодныя канцы прышытага пояса выконвалі ролю засцёжкі. Калі канцы былі доўгія, то, перш чым завязваць, пояс абкручвалі вакол стану. На вузенькіх, павязаных на таліі, паясках жанчыны насілі розныя рэчы, напрыклад, ключы ад скрыні. Гэты звычай быў вядомы з даўніх часоў. Археолагі ў многіх старажытных пахаваннях на тэрыторыі Беларусі, часцей за ўсё ў жаночых, знаходзяць падвешаныя да паясоў розныя ўжытковыя прадменты і амулеты: скураныя сумачкі-кашалькі, касцяныя грабеньчыкі, ключыкі, лыжачкі, падвескі ў выглядзе коней, металічныя бразготкі.

У зімовым адзенні пояс, павязаны паверх світкі ці кажуха, надзейна фіксаваў адзенне на целе жанчыны, дапамагаў захоўваць пэўныя формы касцюма.

Пояс насілі і дзеці. Зусім маленькія, гадоў да двух-трох, маглі хадзіць у адных кашулях. Малыя дзеці не заўсёды мелі спецыяльны паясок. Яго ролю магла выконваць любая тасёмка ("аборка") з нітак альбо тканіны. З узростам наяўнасць паяска ў дзіцячым касцюме пастулова становіцца больш абавязковай. У вёсцы Неглюбка Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці дзяўчынкі з 4-7 гадоў пачыналі насіць паясное адзенне. Да яго абавязкова дадаваўся вузенькі чырвоны паясок. Калі дзяўчына дасягала ўзросту нявесты, яна атрымлівала права насіць панёву-плахту, а разам з панёвай – і шырокі чырвоны плецены пояс.

Завязвалі дзеці пояс звычайна ў адзін абхват. Даўжыня пояса вызначалася з разліку абхвату таліі і прыкладна 80 см на завязкі.

Вузенькія і кароценькія, да 120-150 см даўжынёй, паяскі былі прыналежнасцю дзяцей. Вузкія паяскі такога тыпу, якімі карысталіся дарослыя, маюць памер у межах 170-200 см.

Падпяразвалі дзеці поясам і зімовае адзенне.

Святочныя паясы ў параўнанні з паясамі штодзённага выкарыстання былі шырэйшыя, мелі больш прыгожыя ўзоры і мудрагеліста ўпрыгожаныя канцы.

Звычайная даўжыня шырокіх паясоў – 220-240 см. Відаць, завязвалі іх у адзін абхват. Пояс накладвалі ззаду, пераводзілі наперад і завязвалі. Самым простым спосабам фіксацыі канцоў пояса быў звычайны вузел, канцы пояса віселі і былі аднолькавай даўжыні. Калі пояс быў доўгі альбо было жаданне прыгажэй аформіць месца завязвання, пояс завязвалі сіметрычным ці асіметрычным бантам. Пры паўсядзённым выкарыстанні завязаныя на поясе вузел і банты звычайна размяшчалі па цэнтры фігуры. Па меркаваннях зручнасці месца завязвання маглі размяшчаць збоку ці нават ззаду на спіне.

У святочных камплектах адзення, а таксама пры падпяразванні верхняга адзення, месца размяшчэння вузла і бантаў падпарадкоўвалі тым ці іншым правілам. Тут можна прасачыць асобныя мясцовыя асаблівасці. У адных мясцовасцях нежанатыя хлопцы і жанатыя мужчыны завязвалм пояс па-рознаму: адны злева, а другія справа. У іншых мясцовасцях і хлопцы і мужчыны завязвалі пояс аднолькава.

Шырокія тканыя і асабліва плеценыя паясы як мужчыны, так і жанчыны маглі не завязваць, а мацаваць пры дапамозе розных прыёмаў скручвання канцоў з наступным падтыканнем пад раней накладзены слой пояса. Пояс пры такім спосабе павязвання абавязкова ахопліваў стан два разы.

*Літаратура:*

1 Этнаграфія Беларусі: энцыкл. – Мінск : БелСЭ, 1989. – 575 с.

# 3. ПРАКТЫЧНЫ РАЗДЗЕЛ

## 3.1 Беларускія народныя паясы

Пояс, пас. Бытавалі

- плеценая
- тканая
- вітая

з нітак альбо скуры доўгая вузкая стужка для падпярэзвання.

Лакальная назва **апаяска**. Вядомы з сярэдзіны 1-га тысячагоддзя.

На Беларусі бытавалі пераважна паясы **тканыя, плеценыя і вітыя**, а таксама **вязаныя** пруткамі і кручком (даўжынёй 150-300 см, шырынёй 1,5-10 см).

*Арнаментыка* народнага пояса вызначаецца разнастайнасцю геаметрычных узораў:

- падоўжныя, папярочныя і касыя палоскі,
- крыжыкі,
- грабеньчыкі,
- ромбы.

Паясы *аздаблялі*:

- кутасамі,
- махрамі,
- бісерам, уплеценым паміж тканымі палоскамі,
- саламянымі ўстаўкамі,
- нашытымі кавалачкамі тканіны.

Пераважала спалучэнне колераў чырвонага з белым фонам (у невялікай колькасці ўводзіўся жоўты, сіні, зялёны, чорны). Шматколерныя ўзоры характэрны для поўдня Заходняга Палесся.

Пояс – неад'емная частка нацыянальнага адзення беларусаў. Ім падпярэзвалі кашулі і верхняе адзенне (мужчынскія паясы былі звычайна шырэйшымі за жаночыя і дзіцячыя). Завязвалі іх вузлом спераду або збоку, абкручваючы вакол стану ў залежнасці ад памераў 1-3 разы, падтыкалі па баках так, каб канцы звісалі на 20-40 см.

На поясе ці за поясам насілі сякеру, нож, шабету, капшук, грабеньчык, ключы. Ідучы ў поле або ў лес, на поясе неслі збан з вадой, каробку, палатняную торбу, спарыш з абедам.

**Шабета** – невялікая скураная сумачка-кашалёк, у якой насілі крэсіва, сцізорык, люльку, тытунь, медзякі і інш. неабходную дробязь. Называлі таксама каліта, кайсцерка. Тыповая дэталь традыцыйнага касцюма беларуса сярэдняга і пажылога ўзросту ў 18-19 ст. Насілі з правага боку, мацавалі да пояса або да раменьчыка, перакінутага цераз плячо. Мела форму прамавугольніка 9-16х8-12 см з кляпам на ўсю шырыню (на Падняпроўі вядомы шабеты аб'ёмныя, авальнай формы).

Спецыяльным поясам – спавівачом – спавівалі немаўлят, вузкія ўзорыстыя паясы-падвязкі служылі і аборамі. Паясы-крайкі прышывалі да спадніц і фартукоў, а вузкімі плеценымі або вітымі паясамі абшывалі каўняры, барты і рукавы світ, падолы спадніц.

Важнае месца адводзілася поясу ў розных абрадах, асабліва вясельным. Дзяўчына дарыла пояс сватам у час сватання, жаніху разам з кашуляй і нагавіцамі напярэданні вяселля, бацьку і маці жаніха, музыкам і інш. удзельнікам вяселля. У час вянчання пад ногі маладым клалі пояс і ручнік, да стала маладую вялі таксама на поясе. На другі дзень пасля вяселля, падмятаючы ў хаце, маладая завязвала пояс на венік, а ідучы па ваду, клала пояс разам з кавалкам каравая на студню. На розных этапах вяселля маладой даводзілася дарыць да сотні паясоў, таму дзяўчына пачынала рабіць паясы задоўга да вяселля. Поясам абвязвалі першы сноп ураджаю, які ставілі ў хаце на покуці. У час пахавання на поясе вялі каня, які вёз на могілкі нябожчыка.

Паясам прыпісвалі розныя магічныя функцыі; лічылі, што пояс надае чалавеку сілу, аберагае ад хвароб і няшчасных выпадкаў. Каб у будучым сямейным жыцці быў дастатак, дзяўчына перад шлюбам развешвала паясы ў хляве, свірне, над скрыняй. Перад Новым годам гаспадыня звязвала поясам папарна розныя прадметы, каб жывёла ў гаспадарцы "паравалася".

На Беларусі паясы паўсюдна выраблялі да 1930-х гг. (на захадзе Беларусі і ў 40-я гг.).

**Віццё мастацкае** – адзін з асноўных спосабаў вырабу паясоў, шнуроў, абор і інш. бытавых рэчаў.

Тэхнікай блізкае да прадзення: 2 суканыя пасмы валакністага матэрыялу ці воласу злучаюць у адну вяроўку ці матуз.

Вядома з глыбокай старажытнасці, адбіткі шнуроў знаходзяць на посудзе культуры шнуравой керамікі бронзавага веку. У якасці матэрыялу на Беларусі найчасцей выкарыстоўваюць лён, пяньку, радзей воўну, конскі волас, лыка.

Віццё бывае

- ручное (пальцамі або з дапамогай 2 драўляных кручкоў)
- машыннае.

Высокімі мастацкімі якасцямі і тэхнічным майстэрствам выканання адметныя мужчынскія вітыя паясы ў народным касцюме. Вырабляюць іх звычайна з белай і чырвонай пасмаў воўны аднолькавай таўшчыні. Пасмы звіваюць, утвараючы круглы пярэсты шнур, абодва канцы якога заканчваюцца пышнымі кутасамі.

Падобнымі, але вузейшымі шнурамі аздаблялі традыцыйныя касцюмы, гарсэты, світы, галаўныя ўборы і інш. З добра вычасанага лёну ці канапель вілі матузкі-тасёмкі для шнуравання гарсэтаў, падпяразвання спадніц, прыгожыя аборы для святочных пасталоў ці лапцей.

**Пляценне паясоў** – выраб паясоў у выглядзе круглых або плоскіх пляцёнак з нітак і паскаў скуры. На Беларусі найбольш пашырана пляценне паясоў

- на пальцах,
- на сцяне,
- на калодачцы.

Пры *пляценні на пальцах* на 3 сярэднія пальцы адной рукі і 2 (указальны і сярэдні) другой адзявалі па адной пятлі. Свабодным бязменным пальцам то правай, то левай рукі паперамена крайнія петлі з указальных пальцаў працягвалі ў сярэдзіну пляцёнкі. Узор “у елачку” ўтвараўся чаргаваннем каляровых нітак у петлях.

*Пляценне на сцяне* (на спецыяльнай раме або любых паралельных перакладзінах) выконвалі пераплятаючы нацягнутыя ніткі пальцамі. Пляцёнка выпляталася адначасова з двух бакоў (пасярэдзіне ўтвараўся характэрны злучальны шоў).

*Літаратура:*


1 Васа (Селівончык, В. І.) Беларускія народныя паясы : тэхнікі вырабу, арнамент / манахіня Васа (В. І. Селівончык). – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 303 с. : іл.

2 Селівончык, В.І. Народныя беларускія паясы : дапаможнік па вырабу / В. І. Селівончык. – Мінск, 1989. – 36 с.

3 Селівончык, В.І. Ткацтва на дошчачках : практычны дапаможнік / В. І. Селівончык. – Мінск : Медысонт, 2009. – 64 с. : іл.

# 4. РАЗДЗЕЛ КОНТРОЛЮ ВЕДАЎ

## 4.1 Заданні для кантралюемай самастойнай работы студэнтаў

Тэматыка рэфератаў і прэзентацыйі:

1. Аўчыннае рамяство.
2. Бондарства. Прылады працы, вырабы. Вядомыя майстры.
3. Вышыўка. Класіфікацыя. Рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці.
4. Ганчарства. Цэнтры развіцця. Вядомыя майстры.
5. Гарбарства.
6. Гутніцтва.
7. Здабыўныя промыслы. Віды. Рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці.
8. Злотніцтва.
9. Кавальства.
10. Выраб кафлі. Віды і спосабы аздаблення.
11. Кравецкае рамяство, крашаніна. Вырабы, цэнтры развіцця.
12. Набойка. Цэнтры развіцця.
13. Пляценне. Прылады працы, вырабы. Вядомыя майстры.
14. Прадзенне. Прылады і матэрыялы.
15. Выраб рагож і цыновак.
16. Разьба па дрэве.
17. Стальмашнае рамяство.
18. Ткацтва. Тэхнікі іматэрыялы.
19. Шавецкае рамяство. Цэнтры развіцця.
20. Шапавальнае рамяство. Цэнтры развіцця. Вядомыя майстры.

# 5. ДАПАМОЖНЫ РАЗДЗЕЛ

## Вучэбныя праграмы

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар універсітэта
_________________Н.У.Карчэўская
____ ____________2024 г.

Рэгістрацыйны № ВД-______/вуч.

# МАСТАЦТВА НАРОДНЫХ ПРОМЫСЛАЎ І РАМЁСТВАЎ БЕЛАРУСІ

*Вучэбная праграма установы вышэйшай адукацыі*
*дысцыпліны модуля для спецыяльнасці*
*6-05-0213-02 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва:*
*народныя рамёствы і этнадызайн*

2024

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарту вышэйшай адукацыі 6-05-02-009/пр. от 18.01.2023 па спецыяльнасці 6-05-0213-02 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: народныя рамёствы і этнадызайн.

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*С.В. Матвейчык*, старшы выкладчык кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*Я.Ф. Шунейка*, загадчык кафедры гісторыі і тэорыі мастацтваў установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт;

*Н.В. Петухова*, загадчык кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат педагагічных навук

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол ад , № );

*навукова-метадычным саветам у*становы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна “Мастацтва народных промыслаў і рамёстваў Беларусі” з’яўляецца адным з кампанентаў адукацыйнага працэсу, які прадугледжвае дасягненне неабходнага ўзроўню прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў па спецыяльнасці “Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва: народныя рамёствы і этнадызайн”. Праграма вучэбнай дысцыпліны разлічана на засваенне студэнтамі матэрыялу па гісторыі і тэхналогіі мастацкіх рамёстваў і промыслаў.

Вучэбная дысцыпліна “Мастацтва народных промыслаў і рамёстваў Беларусі” арганічна звязана з шэрагам вучэбных дысцыплін: “Гісторыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва”, “Асновы кампазіцыі”, “Дэкаратыўная кампазіцыя”, “Мастацкае праектаванне”, “Праектная графіка”.

*Асноўнай мэтай* дысцыпліны “Мастацтва народных промыслаў і рамёстваў Беларусі” з’яўляецца фарміраванне ў студэнтаў ведаў, уменняў і навыкаў па гісторыі, тэорыі і тэхналогіі народных мастацкіх промыслаў і рамёстваў Беларусі.

*Задачы дысцыпліны:*

– раскрыць асаблівасці традыцыйнай беларускай культуры праз аналіз гісторыі развіцця промыслаў і рамёстваў Беларусі;

– пазнаёміць з рэгіянальнымі і лакальнымі адметнасцямі, а таксама творчасцю вядучых народных майстроў Беларусі;

– авалодацьтэхналогіяй народных промыслаў і рамёстваў Беларусі.

У выніку засваення дысцыпліны студэнт павінен *ведаць*:

– класіфікацыю народных мастацкіх промыслаў і рамёстваў;

– гісторыю ўзнікнення, этапы развіцця і сучасны стан народных мастацкіх промыслаў і рамёстваў;

– традыцыйныя цэнтры развіцця народных мастацкіх промыслаў і рамёстваў;

*умець*:

– аналізаваць творы народнага мастацтва Беларусі;

– выяўляць месца і ўзаемасувязь промыслаў і рамёстваў з традыцыйным побытам;

*валодаць*:

– традыцыйнай тэхналогіяй стварэння мастацкага вырабу.

Засваенне вучэбнай дысцыпліны павінна забяспечыць фарміраванне наступнай *спецыяльнай кампетэнцыі:* Выкарыстоўваць традыцыйныя прыёмы народных рамстваў для стварэння рэчаў, прызначаных для аздаблення прадметна-пpасторавага асяроддзя і касцюма; аналізаваць творы народнага мастацтва з улікам вобразна-пластычнай і змястоўнай трактоўкі, вызначаць мастацка-эстэтычныя якасці народнага жывапісу, графікі і скульптуры і выяўляць рэгіянальную і лакальную спецыфіку промыслаў і рамёстваў.

Вывучэнне дысцыпліны ажыццяўляецца на лекцыйных, практычных занятках, самастойных занятках.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен не толькі набыць тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобовы, духоўны патэнцыял, сфармаваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным жыцці краіны.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне дысцыпліны "Мастацтва народных промыслаў і рамёстваў Беларусі" прадугледжана 98 гадзін, з іх 62 гадзіны аўдыторныя (у тым ліку 12 гадзін лекцый, 38 гадзін практычных заняткаў), 12 гадзін кантролю за кіруемай самастойнай работай студэнтаў.

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі. Форма атэстацыі па вучэбнай дысцыпліне – залік.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### Уводзіны.

Мэты і задачы вучэбнай дысцыпліны. Прадмет вывучэння. Структура курса. Тэрміналогія дысцыпліны. Класіфіацыя рамёстваў і промыслаў. Здабыўныя промыслы. Асаблівасці мастацка-рамесніцкай дзейнасці.

Грамадскае аб'яднанне "Беларускі саюз майстроў народнай творчасці".

Сістэма мастацкіх промыслаў Беларусі. Дзяржаўны канцэрн "Белмастпромыслы". Фабрыкі мастацкіх вырабаў. Асартымент вырабаў мастацкай прамысловасці Беларусі.

### *Тэма 1. Кераміка і ганчарства.*

Тэхніка і тэхналогія ганчарства. Нарыхтоўка сыравіны. Ганчарны круг і яго віды. Фармоўка і абпал вырабаў. Аздабленне керамікі і памяншэнне порыстасці чарапка. Вашчэнне. Гартаванне. Дымленне. Паліваная кераміка. Фляндроўка. Асноўныя ганчарныя цэнтры. Рэгіянальныя асаблівасці керамікі. Традыцыйныя формы ганчарных вырабаў. Вырабы гаспадарчага прызначэння. Утылітарна-дэкаратыўная кераміка. Дробная пластыка. Гліняная цацка.

Сучасная кераміка.

### *Тэма 2.Вырабы з саломы і лазы.*

Салома – сімвал урадлівасці ў традыцыйных народных уяўленнях. Аграрна-магічная сімволіа саламяных вырабаў. Выкарыстанне саломы ў каляндарных абрадах.

Аб'ёмна-пасторавыя канструкцыі. Саламяны павук.

Аплікацыя і інкрустацыя саломкай. Жлобінская фабрыка мастацкіх Саламяныя дываны.

Сучаснае мастацтва саломапляцення і лазапляцення.

### *Тэма 3. Дрэваапрацоўка.*

Агульная характарыстыка дрэваапрацоўчых рамёстваў. Матэрыялы і спосабы іх апрацоўкі. Цяслярства. Сталярныя вырабы: прадметы хатняга ўжытку, прылады працы, мэбля. Стальмашнае рамяство: транспартныя сродкі, элементы коннай вупражы. Бандарства. Даўбёжнае рамяство. Такарнае рамяство.

Класіфікацыя разьбы па дрэву. Гранёна-выемчатая разьба. Плоскарэльефная разьба. Праразная разьба. Рэльефная разьба. Аб'ёмна-скульптурная разьба. Камбінаваная разьба. Геаметрычная разьба.

Сучаснае мастацтва дрэваапрацоўкі.

### *Тэма 4. Роспіс.*

Народны мастацкі роспіс. Маляванка.Матэрыялы і тэхнічныя прыёмы. Сфера выкарыстання мастацкага роспісу: мэбля, транспартныя сродкі, рэчы побытавага і абрадавага прызначэння.

Пісанка. Спосабы дэкарыравання. Васкаванне, гравіраванне. Набіванка. Інструменты і тэхналогія. Дошкі-клішэ.

Роспіс па шкле. Час бытавання і прызначэнне. Тэматыка і характар малюнка. Тэхналогія выканання.

Сучасны стан развіцця рамяства. Дэкаратыўны жывапіс.

### *Тэма 5. Апрацоўка металаў.*

Металы і асноўныя спосабы іх апрацоўкі.

Кавальства ў народным побыце. Віды кавальскіх вырабаў. Здабыванне і апрацоўка сыравіны. Кузня і яе абсталяванне. Традыцыйныя тэхнікі і тэхналогіі. Інструменты і матэрыялы. Асноўныя тэхналагічныя працэсы. Медніцтва. Злотніцтва.

Сучаснае мастацкае кавальства.

### *Тэма 6. Тэкстыльныя рамёствы і промыслы.*

Разнастайнасць прыёмаў работы з традыцыйнымі тэкстыльнымі матэрыяламі. Рацыянальнасць работы. Улік якасцей матэрыялу і прызначэння вырабу. Характар дэкору. Тэхналогія выканання. Сучаснае тэкстыльнае мастацтва.

Этапы работы над вырабам. Аналіз традыцыйнай тэхналогіі вырабу тэкстыльных прадметаў. Эскіз. Этапнасць выканання. Падбор матэрыялаў і абсталявання. Выкананне пробы ў матэрыяле. Прыёмы афармлення вырабу.

### *Тэма 6.1. Беларускі традыцыйны строй. Асноўныя элементы касцюма.*

Народны строй. Рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці строяў. Гендэрныя, саслоўныя, узроставыя асаблівасці адзення. Традыцыйныя колеры, кампазіцыя, прапорцыі. Сыравіна, крой, аздабленне, спосаб нашэння.

Традыцыйны жаночы комплекс. Мужчынскі касцюм. Верхняе адзенне. Абутак. Упрыгожванні. Традыцыйныя і сучасныя матэрыялы і інструменты.

### *Тэма 6.2. Традыцыйнае ткацтва.*

Ткацтва. Інструменты і абсталяванне. Тыпы ткацкіх станкоў. Матэрыялы і сыравіна. Прадзенне і фарбаванне. Падрыхтоўка кроснаў да ткацтва. Снаванне. Навіўка асновы. Віды і тэхнікі ткацтва. Двухнітовае і

шматнітовае ткацтва. Закладное, бранае, выбарнае, ажурнае, пераборнае, падвоенае ткацтва. Утылітарна-дэкаратыўныя тканіны і тканіны для адзення. Посцілкі. Ручнікі. Ходнікі. Абрусы.

Карункі. Вязаныя і плеценыя карункі. Тэхналогія вырабу. Матэрыялы і прылады.

### *Тэма 6.3. Традыцыйная вышыўка.*

Класіфікацыя швоў і тэхніка выканання. Інструменты і матэрыялы. Аздабляльныя швы. Арнаментальныя лікавыя швы. Працяг. Насціл. Лікавая гладзь. Шоў “роспіс”. Вышыўка крыжам. Ажурныя швы. Мярэжка. Дэкаратыўна-канструктыўныя швы. Прыёмы краявога афармлення. Швы для памяншэння лінейных памераў тканіны. Маршчэнне.

### *Тэма 6.4. Беларускія народныя паясы.*

Рытмічная арганізацыя кампазіцыі. Асаблівасці каларыту. Традыцыйныя беларускія паясы ў музейных зборах.

Спосабы вырабу. Інструменты і прылады. Плеценыя, вітыя, тканыя паясы. Пляценне на пальцах. Аб’ёмнае пляценне ў чатыры пучкі. Плоскае пляценне. Пляценне на калодачцы. Ткацтва на дошчачках. Заправачны малюнак. Ткацтва на ніце і бердзечку. Віды сноўкі. Заправачная схема. Тэхніка ткання.

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**
*для спецыяльнасці 6-05-0213-02 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва*

| Назва тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя заняткі | | |
| Уводзіны | 1 | | | |
| Тэма 1. Keраміка і ганчарства | 2 | | | вуснае апытанне |
| Тэма 2. Вырабы з саломы і лазы | 2 | | | рэферат |
| Тэма 3. Дрэваапрацоўка | 2 | | | вуснае апытанне |
| Тэма 4. Роспіс | 2 | | | вуснае апытанне |
| Тэма 5. Апрацоўка металаў | 2 | | | вуснае апытанне |
| Тэма 6. Тэкстыльныя рамёствы і промыслы | 1 | 2 | 4 | |
| 6.1 Беларускі традыцыйны строй. Асноўныя элементы касцюма | | 2 | | рэферат |
| 6.2 Традыцыйнае ткацтва | | 2 | | рэферат |
| 6.3 Традыцыйная вышыўка | | 16 | 4 | прагляд работы ў матэрыяле |
| 6.4 Беларускія народныя паясы | | 16 | 4 | прагляд работы ў матэрыяле |
| Усяго: | 12 | 38 | 12 | |

**ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ**

*для спецыяльнасці 6-05-0213-02 Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва (завочная форма навучання)*

| Назва тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | Самастойная работа | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | лекцыі | практычныя заняткі | | |
| Уводзіны | 1 | | | |
| Тэма 1. Кераміка і ганчарства | | | 4 | вуснае апытанне |
| Тэма 2. Вырабы з саломы і лазы | | | 4 | рэферат |
| Тэма 3. Дрэваапрацоўка | | | 2 | вуснае апытанне |
| Тэма 4. Роспіс | | | 4 | вуснае апытанне |
| Тэма 5. Апрацоўка металаў | | | 2 | вуснае апытанне |
| Тэма 6. Тэкстыльныя рамёствы і промыслы | 1 | 2 | 4 | |
| 6.1 Беларускі традыцыйны строй. Асноўныя элементы касцюма | | 1 | 6 | рэферат |
| 6.2 Традыцыйнае ткацтва | | 1 | 4 | рэферат |
| 6.3 Традыцыйная вышыўка | | 2 | 4 | прагляд работы ў матэрыяле |
| 6.4 Беларускія народныя паясы | | 2 | 4 | прагляд работы ў матэрыяле |
| Усяго: | 2 | 6 | 38 | |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*


1. Сахута, Я. М. Беларускае народнае мастацтва / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2011. – 367 с.
2. Шауро, Г. Ф. Народные художественные промыслы и декоративно-прикладное искусство : учебное пособие / Г. Ф. Шауро, Л. О. Малахова. – Минск : РИПО, 2015. – 173, [1] с.


*Дадатковая*


1. Лобачевская, О. А**.** Белорусский народный текстиль. Художественные основы, взаимосвязи, новации / О. А. Лобачевская. – Минск : Белорусская наука, 2013. – 527 с.
2. Селівончык, В. І. Ткацтва на дошчачках : практычны дапаможнік / В. І. Селівончык. - Мінск : Медысонт, 2009. - 64 с.
3. Селивончик, В. И. Возрождение ремесла : пособие по ручному узорному ткачеству / В. И. Селивончик, М. Н. Винникова. - Минск : Полымя, 1993. - 142, с.
4. Арнаменты Падняпроўя - Мінск : Беларуская навука, 2004. - 606 с.
5. Віннікава, М. М. Скарбы вясковых куфраў / М. М. Віннікава, П. А. Богдан. - Мінск : Беларуская Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2009. – 180 с.
6. Лабачэўская, В.А. Зберагаючы самабытнасць: З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 375 с. : іл.
7. Кацар, М. С. Беларускі арнамент : ткацтва, вышыўка / М. С. Кацар. – 2-е выд. - Мінск : Беларуская Энцыкл. імя Петруся Броўкі, 2009. - 223 с. : іл.
8. Сахута, Е. М. Художественные ремесла и промыслы Белоруссии / Е. М. Сахута, В. А. Говор. - Минск : Наука и техника, 1988. - 266 с.
9. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. – Мінск : Вышэйшая школа, 2001-2013.
10. Лобачевская, О. А. Белорусский народный костюм: крой, вышивка и декоративные швы / О. А. Лобачевская, З. И. Зимина. – Минск : Беларуская навука, 2009. – 280 с. : илл.
11. Сахута, Я. М. Белорускае народнае кавальства / Я. М. Сахута. – Мінск : Белорусь, 2015. – 174 с. : іл.
12. Сахута, Я. М. Белорускае народнае ганчарства / Я. М. Сахута. – Мінск : Белорус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2013. – 224 с. : іл.


### Рэкамендуемыя сродкі дыягностыкі

Для дыягностыкі прафесійных кампетэнцый і кантролю якасці адукацыі студэнтаў рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя сродкі дыягностыкі:

- метады вуснай дыягностыкі ведаў (апытанне);
- метады практычнай дыягностыкі (напісанне даклада, складанне слайд-прэзентацыі, прагляд работы ў матэрыяле).

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананню самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў арганізуецца ў адпаведнасці з палажэннем пра самастойную работу студэнтаў і ажыццяўляецца ў выглядзе аудыторных і пазааудыторных форм. Па вучэбнай дысцыпліне распрацоўваецца вучэбна-метадычны комплекс з матэрыяламі і рэкамендацыямі, якія дапамогуць студэнту ў арганізацыі самастойнай работы. Для ацэнкі якасці самастойнай работы ажыццяўляецца кантроль за яе выкананнем.

Самастойная работа накіравана на фарміраванне навыкаў работы студэнтаў пападбору літаратуры адпаведна тэматыцы, аналізу тэарэтычнага матэрыялу, яго прадстаўленню ў выглядзе рэферата, слайд-прэзентацыі або практычнай работы.

## 5.2 Асноўная літаратура

1. Лабачэўская, В. А. Зберагаючы самабытнасць: З гісторыі народнага мастацтва і промыслаў Беларусі / В. А. Лабачэўская. – Мінск : Беларуская навука, 1998. – 375 с. : іл.
2. Рудніцкая, Г. Р. Беларуская народная вышыўка. Працяг. У дзвюх частках. Частка 1. Дапаможнік / Г. Р. Рудніцкая. – Мінск : Капітал Прінт, 2022. – 84 с. : іл.
3. Сахута, Я. М. Беларускае народнае мастацтва / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2011. – 367 с. : іл.
4. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў: у 6 т. - Мінск : Бел. Навука, 2001 -2013. – 6 т.
5. Цітоў, А. К. Краіна майстроў: Рамесныя цэхі XVI – XVIII стст. / А.К. Цітоў. - Мінск: Беларус. Энцыкл. Імя П.Броўкі, 2013. – 160 с.

## 5.3 Дадатковая літаратура

1. Белорусы Москвы. XVII век / сост. О. Д. Баженова, Т. В. Белова. – Минск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2013. – 472 с. : ил.
2. Лобачевская, О. А. Белорусский народный текстиль : художественные основы, взаимосвязи, новации / О. А. Лобачевская. – Минск : Беларуская навука, 2013. – 527 с. : ил.
3. Раманюк, М. Ф. Беларускае народнае адзенне / М. Ф. Раманюк. – Мінск : Беларусь, 1981. – 212 с. : іл.
4. Рудніцкая, Г. Р. Беларуская народная вышыўка : аздабляльныя швы / Г. Р. Рудніцкая. – Мінск : Капітал Прінт, 2023. – 92 с. : іл.
5. Сахута, Я. М. Сучаснае народнае мастацтва Беларусі / Я. М. Сахута. – Мінск : Беларусь, 2013. – 255 с. : іл.
6. Селивончик, В. И. Возрождение ремесла : пособие по ручному узорному ткачеству / В. И. Селивончик, М. Н. Винникова. - Минск : Полымя, 1993. – 142 с.
7. Сялянская энцыклапедыя ў творах Мікалая Тарасюка : альбом-манаграфія / аўтар тэксту і ўкладальнік В. Лабачэўская; фотамастак Г. Ліхтаровіч. – Мінск : Літаратура і мастацтва, 2008. – 176 с. : іл.